ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Гіры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. задатку.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-85
„ абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 3 лютага 1930 г.
№ 28 (3536)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

МЕСЯЧНІК ЛЕСАЗАГАТОВАК

ВЫВАЗКА ЛЕСУ ІДЗЕ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

Мясцовыя арганізацыі не дапамагаюць лесазагатоўкам

Кулацтва слаба прыцягнута да гужавой павіннасьці

Дабіцца пералому ў лесазагатоўках

Тэлеграма ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Учора за подпісам сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГЭЯ і старшыні СНК тав. ГАЛАДЗЕДА, разаслана тэлеграма ўсім сакратаром акругкомаў партыі і старшыням акрвыканкомаў.

У тэлеграме адзначаецца, што, ня гледзячы на рад мерапрыемстваў партыі і ўлады, МЯСЦОВЫЯ ОРГАНЫ НЕ АДДАЮЦЬ дастатковай увагі справе загатовак і вывазкі лесу.

Некаторыя мясцовыя арганізацыі зусім адмаўляюцца прымаць удзел у лесазагатоўках.

Такія адносіны да лесазагатовак ставяць вывазку лесу пад пагрозу катастрофы.

Становішча з вывазкаю і загатоўкамі лесу зусім не адпавядае важнасьці гэтае справы.

Пад асабістую адказнасьць сакратароў акругкомаў і райкомаў, старшынь акрвыканкомаў, райвыканкомаў і сельсаветаў катэгарычна прапануецца выкарыстаць месячнік для абавязковага ўзмацненьня тэмпу вывазкі і загатоўкі.

Трэба дабіцца рашучага забесьпячэньня выкананьня пляну вывазкі і загатовак лесаматар'ялаў.

У тэлеграме прапануецца забясьпечыць удзел калгасаў у справе вывазкі лесу. Павінны быць прыняты рашучыя меры да 100-процантнага забесьпячэньня лесавывазак патрэбнаю колькасьцю вазоў, шляхам прыцягненьня да гужпавіннасьці кулацкіх гаспадарак, якія да гэтага дня прыцягнуты ў вельмі недастатковай колькасьці.

У тэлеграму запрапанавана давесьці да ведама сельсаветаў і парт'ячэек і месцы павінны тэлеграфна паведаміць аб пераломе ў справе лесазагатовак і вывазкі лесу.

*

1-га лютага сакратарыят ЦК прыняў пастанову, паводле якое на ўсіх працаўніку, што накіроўваюцца ЦК у вёску для правядзеньня веснавое пасеўнае кампаніі, ускладаецца абавязак дапамагчы мясцом у вывазцы і загатоўках лесу.

Пад суд—за зрыў лесазагатовак

Нядаўна газэта «Зьвязда» паведамляла аб тым, што Вяляцінскі і Мэтчанскі сельсаветы і КСУ (Барысаўскі раён) сарвалі работу па вярбоўцы гужавое сілы і дапамагалі кулацтву ўхіліцца ад гужавое павіннасьці. Лесбел зьвярнуўся да памочніка пракурора Барысаўскага раёну з прапановаю пры цягнуць вінаватых да крымінальнай адказнасьці.

Выкананьне 19 проц. гадавога заданьня

БАБРУЙСК. (Наш. кар). На 30-га студзеня вывезена 19 процантаў гадавога заданьня па стрэлавой драўніне і 15 проц. на дровах.

У раёне працуюць 5.400 лесарубаў і 4.550 коняй. Лік возчыкаў павялічваецца з кожным днём.

Вывазцы лесу перашкаджае адсутнасьць шыннага жалеза; здараюцца выпадкі, калі з прычыны адсутнасьці жалеза нельга рамантаваць папсаваныя колы. На просьбы адпусьціць шыннае жалеза, акрсаюз заявіў, што жалеза, няма. Не хапае падкоў і гакаў.

Вывозяць гужавую сілу

ОРША. (Наш. кар.). У Багушэўскім раёне не хапае гужавое сілы для вывазкі лесу. Між тым органы Наркамправы выдалі дазвол на зывазку за межы раёну 600 фурманак.

Лесбел апрацэставаў гэты дазвол. Упоўнаважаны Экана па лесазагатоўках запрапанаваў Аршанскаму акрвыканкому тэрмінова спыніць вываз фурманак і гужавое сілы з раёнаў акругі і забясьпечыць гужавою сілай лесазагатоўкі.

Поўнасьцю выкарыстаць санную дарогу

Лесбел разаслаў ва ўсе лесазагатоўчыя раёны тэлеграму, у якой прапануецца МАКСЫМАЛЬНА ВЫКАРЫСТАЦЬ САННЫ ШЛЯХ ДЛЯ ВЫВАЗКІ ЭКСПАРТНЫХ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ. Лесбел прапануе скарыстаць месячнік для язмоўнага выкананьня вывазкі і поўнага выкананьня лютаўскага заданьня; ПАСТАВІЦЬ РАБОТУ АПАРАТУ НА БАЯВУЮ НАГУ.

Неабходна наладзіць больш цесную сувязь і дапамогу з боку мясцовых органаў улады, партыйных і грамадзкіх арганізацый, дабіцца максымальнага прыцягненьня кулацтва да гужавой павіннасьці.

У часе вывазкі лесу нельга паслабляць увагі загатоўкам лесу, асабліва дроў. Канкрэтныя заданьні павінны быць даведзены да кожнага дзесятніка, пры чым, апошні павінен асабіста адказваць за поўнае выкананьне даных яму заданьняў.

„Бяз нас справіцеся“

Мясцовыя арганізацыі не аддаюць увагі лесазагатоўкам

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). Ня гледзячы на рад дырэктыў аб дапамозе лесазагатоўчым арганізацыям, мясцовыя органы мала ўвагі аддаюць лесазагатоўкам.

У Хойніцкім раёне старшыні Нябытковскага сельсавету і КСУ, калі вярбоўшчык зьвярнуўся да іх па дапамогу ў арганізацыі арцелі, прад'явілі рвацкія запатрабаваньні: дадаткова выдаць 10 фунт. мукі на куб. мэтр., ня ўлічваць заработку ад лесазагатовак у падатак, павялічыць расцэнкі на 50 проц.

Старшыня Рудня - барталамеевускага КСУ, Чачэрскага раёну, адмовіўся даць людзей на лесараспрацоўкі, заявіўшы, што жадаючых няма, у той час, калі самі беднякі прасілі вярбоўшчыка паслаць іх на работу.

Дрэнна адносяцца на мясцох да вылучэнцаў на лесазагатоўкі. Старыя дзесятнікі не даюць ніякіх паказаньняў вылучэнцам - камсамольцам, а ў выпадку іх памылак узьнімаюць крык: «Прышлі псаваць нам матар'ял». Загалчык Хойніцкага вучастку Лесбелу, атрымаўшы паперку, што да яго пасылаюць трох камсамольцаў, пачасаў галаву і сказаў: «Што я з імі буду рабіць, куды я іх пашлю».

Дуброўская парт'ячэйка, Рэчыцкага раёну, абмежавалася тым, што на агульным сходзе заслухала інфармацыю аб значэньні лесазагатовак. Нездарма на тое, што ў раёне вядуцца вялікія лесараспрацоўкі.

Завод «Калектыўная Праца», у Новае-Беліцы, зусім не падрыхтаваўся да прыёму лесаматар'ялаў. З прычыны недахопу прыёмшчыкаў сялянам прыходзіцца дарэмна чакаць па некалькі гадзін, каб здаць прывезены лесаматар'ял.

Мясцовым арганізацыям трэба рашуча зьмяніць свае адносіны да лесазагатовак і памятаць, што адказнасьць за невыкананьне плянаў загатовак ў значнай ступені прыпадае і на іх.

Б. П.

Лесапагатоўчыя вучасткі па забесьпячэньні продуктамі і прамтаварамі

Белкаапсаюз правёў абследваньне, якое высьветліла рад фактаў недастатковай увагі каапэрацыйных арганізацый да забесьпячэньня рабочых-лесарубаў прадуктамі і прамтаварамі.

У Гомельскай акрузе няма даных аб патрэбнай колькасьці хлеба-фуражу і прамтавараў для асобных лесазагатоўчых раёнаў. У мясцох найбольшага згуртаваньня рабочых да гэтага часу яшчэ не арганізаваны сталоўкі і чайныя.

У Мазырскай акрузе вясковыя крамы не прыстасаваны да патрэб лесарубаў. Час працы ў крамах ня ўзгоднены з часам працы лесарубаў. Дрэнна адбываецца тое, што вясковыя крамы зачынены ў выхадныя дні. Да гэтага часу яшчэ не наладжана забесьпячэньне вясковых крам печаным хлебам, а гэта адчуваецца на забесьпячэньні рабочых лесарубаў.

З Барысаўскага лесараёну паведамляюць, што Бярэзінскае спажывецкае т-ва, якое павінна забясьпечваць рабочых лесазагатовак прадуктамі, ніякіх запасаў для харчаваньня рабочых ня мае.

З Віцебскай акругі паведамляюць, што прадукты паступаюць без затрымкі, але на месцы яны прыходзяць са значным спазьненьнем. Напрыклад, у Бабінавіцкі і Высачанскі каапэратывы прадукты прывозяцца праз 12 дзён пасьля паступленьня нарадаў на іх.

З Бабруйскай акругі паведамляюць, што забесьпячэньне лесазагатовак таксама нездавальняючае. Ёсьць выпадкі, калі спажывецкія т-вы (Лясенское) адмаўляюцца выдаваць прадукты, спасылаючыся на адсутнасьць спэцыяльных фондаў.

Такое-ж становішча паглядаецца і ў іншых акругах.

Трэба адзначыць, што гаспаларчыя арганізацыі ня выконваюць дагавораў на забесьпячэньне рабочых патрэбнымі прадуктамі. Лесбел заключыў умову з Белмясгандлем і Белмалжысаюзам на пастаўку 25 тон сала для рабочых. Гэтым арганізацыям грошы ўжо выплачаны, але да гэтага часу ад Белмалжысаюзу атрымана толькі 1.500 клг. сала, а ад Белмясгандлю нічога не атрымана.

Заключана таксама ўмова з Белкаапсаюзам на дасатаўку ватных паўпольтаў, валёнак і рымарскіх вырабаў для рабочых - лесарубаў. Да гэтага часу названыя рэчы не атрыманы. Ёсьць пагроза, што рабочыя атрымаюць гэтую спэцвопратку тады, калі яна ўжо ня будзе патрэбнаю.

Усе гэтыя недахопы на фронце забесьпячэньня рабочых - лесарубаў наабходнымі харчовымі прадуктамі і прамтаварамі павінны быць тэрмінова зьнішчаны.

2-я Беларуская дывізія выйшла ў аграпаход

Сёньня 2-я Беларуская дывізія вышла ў аграпаход. Байцы на справе, па-ўдарнаму дапамагаюць партыі выканаць генэральную лінію, яшчэ вышэй узьняць калгасны рух, ліквідаваць кулацтва, як клясу, забясьпечыць посьпехам веснавую сяўбу.

Кожны поли мае падрабязна распрацаваны з мясцовымі органамі вытворчы плян паходу (ачыстка насеньня, рамонт інвэнтару, будаваньне памяшканьняў для жывёлы і г. д.). Пры палкох складзены палітычныя брыгады. З часьцямі выяжджаюць 5 кінаперасовак, аграномы. З усімі байцамі загадзя праведзена вялізарная палітычная і арганізацыйная работы. Байцы добра разумеюць мэты паходу і задачы, што стаяць перад імі.

У паход ад рэдакцыі газэты «ЗЬВЯЗДА» і «Рабочий» выяжджаюць спэцкоры.

Усе сілы і сродкі на тое, каб аграпаход і надыходзячая пасеўная кампанія прайшлі, як сапраўды бальшавіцкая вясна.

ПРЫВЕЗЬЛІ КАЛГАСНУЮ ЛІТАРАТУРУ

Польскі фашызм узбройваецца да зубоў

На ўзбраеньне хапае, але не на дапамогу беспрацоўным

ВАРШАВА, 2. Паводле афіцыйных даных рост вайсковага бюджэту вызначаецца наступным чынам: у 1926-27 г. гэтыя выдаткі складалі 622.859 тыс. злотых; у 1927-28 г.—823.171 тысяч зл.; у 1928-29 г.—840.440 тыс. зл.; у 1929-30 г.—912.835 тыс. зл. і апрача таго далатак да пэнсій, у 1930-31 г.—937.916 тыс. зл. плюс розныя дадаткі.

Рост вайсковага бюджэту параўнальна з 1926-27 г. складае 34 проц. Трэба ўзяць пад увагу, што выдаткі на вайсковыя мэты займаюць таксама свае саліднае месца ў бюджэтах іншых міністэрстваў.

Вайсковы бюджэт на 1927-28 г. быў перавышаны на 212 мільёнаў, г. зн. на 40 процантаў з вызначанай сумы, а ў 1928-29 г. на 100 мільёнаў, г. зн. на 70 процантаў усяе вызначанае сумы. Пэнсія для вышэйшых вайсковых чыноўнікаў у гэтым годзе складае суму ў 298 мільёнаў злотых, г. зн. 35 процантаў усяго вайсковага бюджэту. Сума на пэнсію афіцэрам павялічылася на 86 процантаў.

Так званы дыспазыцыйны фонд, прызначаны для барацьбы з рэвалюцыйным рухам, складае 8 мільёнаў рублёў. Будоўля вайсковых памяшканьняў — 19 мільёнаў. Датацыя даяржаўных сродкаў вайсковым прадпрыемствам складае 17 з паловаю мільёнаў.

Усе гэтыя лічбы ўзяты з афіцыйных даных. У сапраўднасьці гэтыя лічбы значна большыя.

КРАХ НА БІРЖЫ

ВАРШАВА, 2. Буржуазны орган «Гандлёны Штотылнёвік» наступным чынам малюе біржавы крызіс:

«Начуваны недахват гатоўкі, спабая кан'юнктура ва ўсіх галінах вытворчасьці, узрастаючы пік банкрутцтваў, вялізарны гаспадарчы крызіс, адсутнасьць пэрспэктыў на палепшэньне—вось асноўныя прычыны заціішша на біржы».

Крывавая расправа над дэманстрацыяй украінскіх сялян

ВАРШАВА, 2. ПАТ паведамляе аб сялянскай дэманстрацыі, арганізаванай 21-га студзеня, у сувязі з галавінаю сьмерці Леніна. Сельроб-лявіцаю ў ваколіцы Каралеўскае Любіцы, Равяруцкага павету. У часе разгону гэтае дэманстрацыі паліцыя ўжыла агнястрэльную зброю. Забіта 2 сялян і шмат паранена.

Масавыя забойствы і арышты ў Віленшчыне

ВАРШАВА, 31. У канцылярыі пасольскага беларускага рабоча-сялянскага клюбу ў Вільні праведзены вобыск. Адначасова адбыліся масавыя вобыскі сярод беларускага насельніцтва — у Вільні і раёне. У Вільні арыштавана 7 чалавек, у раёне—17.

АД'ЕЗД МЭКСЫКАНСКАЕ МІСІІ З МАСКВЫ

МАСКВА, 31. Учора выехаў з Масквы за граніцу ўвесь склад мэксыканскае місіі.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Пастанова СНК РСФСР аб спыненьні чысткі ў школах I-е і II-е ступені па сацыяльнай адзнацы

СНК РСФСР разгледзеў пытаньне аб стварэньні умоў сапраўднае даступнасьці школы для дзяцей рабочых, калгаснікаў, батракоў і беднякоў і аб прыёме дзяцей непрацоўнага насельніцтва.

У гэтай пастанове гаворыцца: партыя і ўрад ня раз зазначалі ўсю важнасьць стварэньня ўмоў сапраўднае максымальнае даступнасьці масавае школы для дзяцей працоўных. Гэта задача вырашана недастаткова правільна. Адсевы і другагодніцтва яшчэ досыць вялікія і закранаюць яны пераважна дзяцей нізкааплачваемых груп рабочых, беднякоў і батракоў.

Побач з гэтым мясцовыя органы ўлады прабуюць вырашыць задачу павялічэньня ўдзельнае вагі дзяцей працоўных у школе шляхам выключэньня з яе дзяцей непрацоўнага насельніцтва. Маюцца выпадкі агульнага выключэньня ў парадку чысткі дзяцей ня толькі непрацоўных элемэнтаў, але і сераднякоў, саматужнікаў і рамеснікаў і г. д. Гэтыя выключэньні пачынаюць прымаць масавы характар, пры чым часта выключэньне з школы дзяцей, якія знаходзяцца ў цяжкіх матар'яльных умовах, ставіць апошніх у становішча амаль поўнае бяспрытульнасьці.

Спробам кулацтва і капіталістычных элемэнтаў гораду варожа ўплываць на школу праз дзяцей павінна быць процістаўлена энэргічная пэдагагічная і грамадзкая дзейнасьць савецкіх настаўнікаў, піянэр-атрадаў, камсамолу і г. д. У сувязі з гэтым выключэньне дзяцей з школы I і II ступені на падставе аднэй толькі адзнакі іх сацыяльнага паходжаньня, або адсутнасьці выбарчых правоў у іх бацькоў — СНК РСФСР лічыць недапушчальным. Гэта супярэчыць задачам сацыялістычнага выхаваньня і перавыхаваньня ўсяго падрастаючага пакаленьня. Гэта тым больш недапушчальна ў сучасны момант, калі абвастрэньне клясавае барацьбы ў краі вельмі часта прыводзіць да расслаеньня ў сем'ях, якія належаць да няпралетарскіх клясавых груп.

Практыка выключэньня і чысткі здольна толькі адыграць наруку варожым клясавым элемэнтам, якія прабуюць затрымаць працэс пераходу ўсяе моладзі на пазыцыю пралетарыяту.

СНК прапануе неадкладна спыніць усякую чыстку вучняў у школах I і II ступені па сацыяльнай адзнацы. Павінны быць прыняты меры да аднаўленьня ў правох выключаных. СНК забараняе абмежаваньне правоў вучняў з асяродзішча непрацоўных колаў насельніцтва ў параўнаньні з іншымі вучнямі.

Вынікі зьніжэньня сабекошту ў прамысловасьці—нездавальняючыя

МАСКВА, 1. ВСНГ СССР падагуліў вынікі зьніжэньня сабекошту ў першым квартале па агульнасаюзнай прамысловасьці.

Вынікі гэтыя даюць надзвычай нездавальняючы малюнак. Уся плянуемая ВСНГ СССР прамысловасьць зьнізіла сабекошт у першым квартале на 4,6 проц. пры заданьні ў 11 проц. Пры гэтым цяжкая індустрыя дае зьніжэньне на 5,8 проц. пры заданьні ў 12,5 проц., а лёгкая—адпаведна—3,6 і 9,6. Сабекошт апалу зьніжаны ў сярэднім на 7 проц. пры заданьні ў 9,1 проц., мэталяпрамысловасьць — сярэдняе зьніжэньне склала ў першым квартале 5,7 проц. пры заданьні ў 13,3 проц. Вельмі адстае чорная мэталургія. Электратэхнічная—сабекошт зьніжаны ў сярэднім на 7,6 проц. пры заданьні ў 15,5 проц., будаўнічыя матар'ялы—сярэдняе зьніжэньне сабекошту склала 5.2 проц., замест 12,8 проц., тэкстыльная дае ў сярэднім зьніжэньне на 4,8 проц. пры заданьні ў 9,55 проц.; швейная—адпаведна — 4,6 проц. і 10,3 проц.; скурана-абутковая—6,91 проц. і 11 проц.; паперовая—7,8 проц. і 13,1 проц.; хэмічная (лёгкая)—5,6 проц. і 12,1 проц. і г. д.

КАЛЕКТЫЎ ІМЯ СТАРОЕ ГВАРДЫІ БАЛЬШАВІКОЎ

МАСКВА, 1. У нямецкай калёніі Энгенфэльд (Закаўказьзе) арганізаваны калгас імя Старое Гвардыі Бальшавікоў.

У сяле Тукменаўцы, Русанаўскага раёну, Барысаглебскае акругі, адбыўся першы сход упоўнаважаных камуны «Чырвоны Кастрычнік». Камуна аб'яднае 7.500 чал. і займае плошчу ў 14.000 гэкт. 120 гаспадароў (100 проц.) вёскі Качунава, Рамаганаўскага раёну, Мардоўскай аўтаномнай вобласьці рашылі арганізаваць «Калгас Асьветы імя тав. Крупскае».

Знойдзены надзвычай каштоўныя архіўныя матар'ялы

МАСКВА, 1. У распараджэньне Інстытуту імя Леніна паступілі надзвычай каштоўныя архіўныя матар'ялы з фондаў Усесаюзнай Акадэміі Навук. Знойдзены архівы Струвэ і Якаўлева—Багучарскага з шматлікімі неапублікаванымі лістамі Пляханава, Аксэльрода, Петрэсава, Струвэ, Булгакова, Вадавозава, Авілава, Багданава і шмат інш. Тут жа аказаліся цікавейшыя матар'ялы з архіву Пяцярбурскага камітэту РСДРП пэрыяду 1905-1906 гадоў; сярод матар'ялаў знойдзены рукапісы і запіскі Леніна, пратакол Пяцярбурскай канфэрэнцыі таго-ж пэрыяду з удзелам Леніна і інш. У бібліятэцы габінэту замежных выданьняў знойдзены бібліятэкі Струвэ, Бонч-Бруевіча, Чарткова, Пяцярбурскага аховнага аддзяленьня, ЦК меншавікоў, ЦК партыі эсэраў і інш.—усяго каля 2.000 выданьняў. Між іншым знойдзены камплекты «Іскры» з паметкамі Леніна (з бібліятэкі Бонч-Бруевіча) з паметкамі Мартава (з бібліятэкі ЦК РСДРП).

НОВЫЯ ЧЛЕНЫ АКАДЭМІІ НАВУК СССР

МАСКВА, 31. Тав. Луначарскі, праф. Волгін і Пісаржэўскі абраны сапраўднымі членамі Акадэміі Навук СССР.

Пабудова новага нафтаправоду

ГРОЗНЫ, 1. Грознафта пастанавіла ў гэтым годзе пачаць пабудову нафтаправоду ад Майкаўскіх нафтавых промыслаў да Туапсэ. Галоўная станцыя па перадачы нафты будзе пабудавана на рацэ Туха, каля станцыі Шырванскае. Адсюль нафтаправодзе пойдзе на злучэньне з нафтаправодам Грозны—Туапсэ. Злучэньне вызначана каля станцыі Хадзіжэнскай. Далей новы нафтаправодзе поўдзе роўнаслежна Грозьненскім да нафтаперагонных заводаў Туапсэ.

Даўжыня новага нафтаправоду — 5 кілёмэтраў. Пабудова нафтаправоду пачнецца гэтымі днямі і павінна быць скончана да 1-га лютага 1931 г. Нафтаправод кожны год будзе пратускаць 1.350.000 тон нафты.

Пуск ніжагародзкага аўтазборачнага завода

НІЖНІ - НОЎГАРАД. 1-га лютага а 8 гадзіне раніцы, адбыўся пуск Ніжагародзкага аўтазборачнага заводу, які пабудаваны паводле апошняга слова амэрыканскае тэхнікі. Новы завод зьяўляецца першым з дзесятку такіх-жа і больш буйных зборачных заводаў, якія паложаць пачатак аўтамабілізацыі краю.

Сёньня на месцы нядаўніх пустак пралетары Ніжняга сабраліся асьвяцаваць новую індустрыяльную перамогу. Пасьля ўрачыстага мітынгу дзесяці першых аўтамабіляў пакінулі цэхі, каб абярнуцца ў трыбуны для выступаючых. Да канца месяца завод выпусьціць 200 аўтамабіляў. Гэтымі днямі ў Маскву прыбудзе чырвоны аўтамашын, якія сабраны на Ніжагарадзкім заводзе.

МАГУТНЫЯ ГІДРАСТАНЦЫІ Ў РАЁНЕ ХІБІНСКІХ АПАТЫТАЎ

ЛЕНІНГРАД, 30. Для эксплёатацыі хібінскіх апатытаў вырашана пабудаваць магутныя гідрастанцыі на рэках Ніва, Коўда, якія ўпадаюць у Белае мора. Гідраўлічная магутнасьць гэтых рэк можа даць да паўмільярду кілёват-гадзін электраэнэргіі ў год. У раёне гэтых рэк пачалося абсьледваньне для вызначэньня месца пабудовы гідрастанцыі.

НОВЫЯ ГІГАНТЫ КАЛЯРОВАЕ МЭТАЛЮРГІІ

Праўленьне Саюзнага аб'яднаньня каляровае мэталюргіі — «Цветметзолото»—ухваліла пастанову аб пабудове трох магутных цынкавых электралітных заводаў. У Кузбасе пастаноўлена пабудаваць цынкавы электралітны завод магутнасьцю ў 50.000 тон цынку і 100.000 тон сернае кіслаты ў год; у Чалябінску—магутнасьцю ў 20 тысяч тон цынку і 40 тыс. тон серкавае кіслаты, а далейшым яго пашырэньнем у два разы; і ў Рыдэры — магутнасьцю ў 20 тысяч тон цынку і 50 тысяч тон серкавае кіслаты. «Гидроцветмету» запрапанавана неадкладна прыступіць да праектаваньня гэтых заводаў.

ПАБУДОВА ЧЫГУНКІ СЫКТЫКВАРПІНЮГ

АРХАНГЕЛЬСК. 30. На пабудову чыгункі ад Сыктыквар (Усьць-Сысольск) — Пінюг у гэтым годзе асыгнавана 8 млн. руб. Усё будаўніцтва будзе каштаваць 23 млн. руб. Агульная даўжыня веткі — 275 клм. Зараз прарубаецца ў лесе прасека даўжынёю ў 11 клм. Будуюцца часовыя баракі, мастпраз нявялікія рэкі і балоты. На адлегласьці 28 клм. ужо скончана пракладка палатна—насыпі. Летам пачнецца ўкладка шпал і пракладка рэек.

ТРЫВОЖНЫЯ НАСТРОІ Ў БЭРЛІНЕ

Паліцыя прыведзена ў баявую гатоўнасьць

БЭРЛІН, 1. Бэрлінская паліцыя з раніцы была прыведзена ў баявую гатоўнасьць, каб мець магчымасьць неадкладна разагнаць дэманстрацыі, у выпадку іх узьнікненьня. Паліцэйскія патрулі на аўтамабілях, патрулі самакатчыкаў, конныя патрулі наглядаюць за ўсімі раёнамі, дзе магчымы збор дэманстрантаў. У распараджэньні бэрлінскае паліцыі знаходзяцца 18 бранявікоў. Паліцыя забясьпечана вялікаю колькасьцю зброі, прычым у паліцэйскіх казармах нават назапашаны калючы дрот. (ТАСС).

АХВЯРЫ ГАМБУРГСКІХ ЦЭРГІБЭЛЯЎ

БЭРЛІН, 1. «Ротэ Фанэ» падае першыя весткі аб ахвярах учарайшых баёў у Гамбургу. 16-гадовы рабочы знаходзіцца пры сьмерці, паранены ў галаву. 65-гадовы рабочы таксама зьбіты паліцэйскімі. Некалькім рабочым паліцэйскія палкамі разьбілі чэрап. На станцыі хуткае дапамогі дастаўлена 10 пяжка параненых рабочых і дружыннікаў рабочых санітарных дружын. Выпадковы праходжы паранены ў галаву. (ТАСС).

ЗАБАРОНА ЎСІХ КАМУНІСТЫЧНЫХ ГАЗЭТ У ГАМБУРГУ

БЭРЛІН, 1. Гамбургскі сэнат забараніў выхад з 1-га лютага і «да асобнага загаду» ўсіх камуністычных газэт. (ТАСС).

Арышт канфэрэнцыі камуністычнага партактыву

БЭРЛІН, 1. Паліцыя разагнала ўчора канфэрэнцыю камуністычнага партактыву Фрыдрыхсхайна. На сход зьявіўся моцны паліцэйскі атрад, які арыштаваў ўсіх 76 удзельнікаў канфэрэнцыі і даставіў іх у паліцэйскую ўправу. У паліцэйскім паведамленьні, гаворыцца, што затрыманыя будуць пакінуты пад арыштам для таго, каб перашкодзіць дэманстрацыі. (ТАСС).

АШУКАНЬНЕ І ЗЬДЗЕКІ НАД РАБОЧЫМІ АНГЛІІ

Урад Макданальда адмаўляецца ад выкананьня сваіх абяцанак

ЛЁНДАН, 1. У свой час ужо паведамлялася, як ангельская «рабочая» партыя выканала свае абяцаньні, якія яна дала выборчыкам у часе прадпрымарнае кампаніі. Замест увядзеньня абяцанага 7-гадзіннага рабочага дня ў капальнях, «рабочы» ўрад вызначыў 7½-гадзінны; замест дапамогі беспрацоўным—зьняў сотні тысяч беспрацоўных з дапамогі і выдаў закон, які зьяўляецца зьдзекам для беспрацоўных.

Зараз орган рабочае партыі «Дэйлі Гэральд» паведамляе, што ўрад мае намер адмовіцца ад правядзеньня ў часе цяперашняе парлямэнцкае сэсіі амаль ад усіх іншых рэформ, якія абяцаны перад выбарамі: ад адмены антыпрафсаюзнага закону, які быў уведзены ўрадам Болдуіна пасьля ўсеагульнае забастоўкі 1926 г., ад правядзеньня ў жыцьцё вашынгтонскага згоду аб 8 адзінным рабочым дні і аб паляпшэньні умоў працы на прадпрыемствах.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Як стала вядома, урад адтэрміноваў на 3 месяцы правядзеньне ў жыцьцё нават убогага закону аб вызначэньні 7½-гадзіннага рабочага дня ў капальнях, такім чынам другі раз ашукаўшы гарнякоў.

Сакратар руху меншасьці прафсаюзу гарнякоў Алісон па гэтай прычыне заявіў: «Рабочы ўрад выкарыстаў 7½ гадзінны рабочы дзень у выглядзе прыманкі з тым, каб атрымаць згоду гарнякоў на новы законапраект. Дабіўшыся гэтае згоды, «рабочы» ўрад зараз адкладвае ўвядзеньне скарочанага рабочага дня з тым, каб потым зусім адмовіцца ад яго. Пытаньне аб скарачэньні рабочага дня можна лічыць зьнятым на заўсёды.

Нагла ашукваючы рабочых, прадаючы на кожным шагу іх інтарэсы, «рабочы» ўрад у той-жа час не за страх, а за совесьць абараняе інтарэсы ангельскага капіталу. Міністар фінансаў Сноўдэн нядаўна зьвярнуўся з Гаагі, пасьля дзеляжу кантрыбуцыі з перамоганае Нямеччыны. Макданальд за зачыненымі дзьвярмі лёнданскае канфэрэнцыі вядзе жорсткую барацьбу, стараючыся абараніць пяршынства Англіі на морах.

У той-жа час, «рабочы» ўрад вядзе палітыку тэрору супроць рабочага руху. Толькі за апошнія два тыдні звыш 600 рабочых Англіі былі прасьледваны паліцыяй. Яшчэ больш жорсткі тэрор урад Макданальда разьвівае ў калёніях, зьверскі падаўляючы нацыянальны рэвалюцыйны рух у Палестыне, Трансёрданіі, Афрыцы, Індыі і г. д.

У адказ на запатрабаваньні аб амністыі палітзьняволеных індусаў міністар унутраных спраў ангельска-індыйскага ўраду Крэрар заявіў, што пра амністыю і гаварыць няма чаго і што ўрад душыў і будзе душыць надалей усякі «мяцежны» рух на карысьць незалежнасьці Індыі.

Такім чынам, урад, на чале якога стаяць выдатнейшыя лідары 2-га інтэрнацыяналу, хутка скочваецца па шляху да яўнага фашызму.

Міруцкі працэс аднавіўся

ЛЁНДАН, 31. Агэнцтва Рэйтэр падае: «Міруцкі працэс аднавіўся. Пракурор Ланггорд Джэмс, выступаючы з доўгаю прамоваю, заявіў, што падсудныя абвінавачваецца не за іх камуністычныя погляды, а за ўдзел у змове, якая мае на мэце пазбавіць ангельскага караля яго сувэрэнных праў над Індыяй.

Рэвалюцыйны кангрэс арабскіх рабочых у Палестыне

ВЕНА, 28. Паводле атрыманых тут з Палестыны вестак, 11-12 студзеня ў Хайфе адбыўся арабскі рабочы кангрэс. На кангрэсе прысутнічаў 51 дэлегат, якія зьяўляюцца прадстаўнікамі многіх тысяч арабскіх рабочых.

На кангрэсе вывяўся жахлівы малюнак становішча арабскага пралетарыяту (адсутнасьць прафсаюзаў, малая зарплата, неабмежаваны рабочы дзень, поўная адсутнасьць сацыяльнага страхаваньня і г. д.). У спрэчках, якія пачаліся пасьля дакладу, рабочыя розных галін працы расказвалі аб жорсткай эксплёатацыі арабскіх рабочых капіталістымі і рэзка нападалі на ўрад. Адзін з рэвалюцыйных дэлегатаў, ня гледзячы на процідзеяньне нацыянал-рэфармістых, падаў палітычную рэвалюцыйную праграму, у якой ён выказаўся за паўстаньне супроць ангельскага імпэрыялізму. Галасаваньне паказала, што большасьць кангрэсу стаіць за адкрытую рэвалюцыйную дэкларацыю. У пастанове канфэрэнцыі таксама ясна адчуваецца барацьба гэтых двух тэндэнцый. Побач з рэзалюцыямі нацыянастычнага характару таксама прынята тару, як напрыклад, аб арганізацыі рад рэвалюцыйных рэвалюцыйнага характару прафсаюзаў ва ўсіх арабскіх краёх, аб вызваленьні ўсіх палітычных зьняволеных і г. д.

Абраны выканком, які складаецца выключна з рабочых. На першым сваім пасяджэньні выканком ухваліў выдаваць прафсаюзную газэту, якая павінна быць афіцыйным органам арабскага рабочага саюзу. Уся грамадзкасьць аддае

Пралетарыят БССР патрабуе рашучага адпору белагвардзейскім налётчыкам

Весткі аб наглым налёце белагвардзейцаў на праўленьне К.-Усх. чыг. выклікалі хвалю пратэстаў працоўных БССР. На многіх фабрыках і заводах адбыліся шматлюдныя мітынгі.

Ва ўхваленых рэзалюцыях рабочыя патрабуюць ад Савецкага ўраду прыняць самыя рашучыя меры, каб пакончыць з правакацыйнымі дзеяньнямі ворагаў СССР. Рабочыя заяўляюць аб сваёй гатоўнасьці па першым закліку стаць на абарону заваёў Кастрычніка.

Так, агульны сход малога рамонту вагонаў ст. Менск пасаж. МБВ чыг. заяўляе — нам мала адных гутарак аб урэгуляваньні адносін на К.-У. чыг. Мы патрабуем неадкладнага разбраеньня рускіх белагвардзейскіх атрадаў, высылкі з тэрыторыі Манчжурыі і арышту ўсіх белагвардзейскіх кіраўнікоў.

Канфэрэнцыя настаўнікаў Менскага раёну МБВ чыг. з абурэньнем пратэстуе супроць наглае пробы белагвардзейшчыны ў Кітаі парушыць добрыя ўзаемаадносіны, якія, дзякуючы цьвёрдай міралюбівай палітыцы Савецкае Улады, былі ўстаноўлены пасьля падпісаньня хабараўскага пратаколу.

— Няхай ведае сусьветная буржуазія і яе агэнты рускія белагвардзейцы, што мы ня хочам вайны, але не дапусьцім ніякіх зьдзекаў на нашымі працаўнікамі на К.-Усх. чыг.

Зараз у адказ на правакацыйную спробу белагвардзейшчыны мы ўсе, як адзін, уносім 1 проц. свае месячнае пэнсіі на пабудову новага самалёта «Асьветнік» і заклікаем пасьледавацелі нашаму прыкладу ўсіх настаўнікаў МБВ чыг.

Рабочыя шчаціннае фабрыкі, заслухаўшы інфармацыю аб налёце белагвардзейцаў на праўленьне К.-Усх. чыг., прынялі рэзалюцыю заяўляючы:

— Мы катэгарычна пратэстуем супроць налёту белагвардзейцаў на нашых прадстаўнікоў, супроць невыкананьня Кітаем сваіх абавязацельстваў аб выдаленьні белых банд з раёну К.-Усх. чыг.

На выпады белабанд

Да пленуму ЦС Асоавіяхіму БССР

За выразную клясавую лінію ў пытаньнях абароны

Працібіць саўгасы і калгасы сапраўднымі апорнымі пунктамі ў рабоце Асоавіяхіму ў вёсцы

Пленум Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму БССР адбываецца ў часе бурнага росту сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяховага наступленьня на капіталістычныя элемэнты і ўзмацненьня пагрозы ўзброенага нападу на СССР, што асаблівай рэакцыю павышае адказнасьць Асоавіяхіму, як перадавога атраду пралетарскае грамадзкасьці ў справе ўзмацненьня абароны краю.

У парадку дня пленуму паказаны асаблівае важнасьці пытаньні. Пленум знаёміцца з 5-гігаловым плянам асоавіяхімаўскай работы, прапрацуе пытаньне непасрэднага ўдзелу Асоавіяхіму ў веснавой пасеўкампаніі і аб работе. ААХ у сацыялістычным сэктары вёскі.

На працягу году год Асоавіяхім выпас у вялізную арганізацыю і наўрад ці трэба спэцыяльна даводзіць неабходнасьць для ААХ 5-цігадовага пляну. Арганізацыя на можа працавацьці, апіраючыся толькі на сёньнішні дзень, не вызначаючы пэрспэктыў свае натупнае работы.

Плян зьвяшча стымулем разгортаньня мэтаду сацыялістычнага спаборніцтва, бо будуць канкрэтныя аб'екты для заключэньня дагавораў, што дапаможа іх ажыцьцяўленьню і перавышэньню. Зусім насьпела пытаньне аб тым, каб гэты плян зьявіўся асноўным у барацьбе за больш хуткія тэмпы работы, і першы год плянавае работы ЦС паказаў, што нават пры арыентовачным пляне, які быў у гэтым годзе, сьць зрухі ў справе ўзмацненьня тэмпу работы. Вазумоўна, у пляне ўлічаны апошнія пасьнае пацяглі, бо паказальнікі дзяржаўнае пяцігодкі, бо ня гэтага плян ААХ быў-бы надуманым і адарваным ад жыцьця.

Пленум зьверне сваю ўвагу на пытаньне непасрэднага ўдзелу ў справе выкананьня апошніх дырэктыў нашае партыі ў правядзеньні веснавое пасеўнае кампаніі.

Пленуму з усёй сур'ёзнасьцю трэ'ўдзе прапрацаваць пытаньне аб рабоце Асоавіяхіму ў сацыялістычным сэктары вёскі. Вялізны рост калгаснага руху, стварэньне раёнаў і округ суцэльнае калектывізацыі стварае рэальныя магчымасьці ўзмацненьню і разгортаньню асоавіяхімаўскае работы. Стварэньне буйных калгасаў, наладжаньне саўгасаў і машына - трактарных станцый даваляюць ставіць пытаньне аб перанясеньні ў гэтыя буйныя цэнтры сацыялістычнага сэктару формы і мэтаду гаралкое работы ў выглядзе куставых, базавых злучэньняў, арганізацыі саветаў ААХ у буйных саўгасах і калгасах, пераходу на навучальна-стражавыя ал'нкі, стварэньня сэкцый і г. д. Гэтым пляхам трэба дабіцца таго, каб ячэйка ААХ саўгасу, калгасу або машына - трактарнае станцыі стала ўзорна - паказальным пунктам дзейнасьці ААХ на вёсцы, прыцягвала да сябе іншыя ячэйкі ААХ, якія знаходзяцца ў яе раёне.

Пасьпяховае наступленьне нашае партыі і ліквідацыя кулацтва, як клясы, яшчэ больш абвастрае гэту барацьбу. За апошні час зрабіліся частымі выпады імпэрыялістых супроць СССР, бо нашы ворагі добра разумеюць, што суцэльная калектывізацыя, зьвязаная з вялізным тэмпам індустрыялізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы,—ёсьць зьнішчэньне апошняе базы, на якую апіраючыся можна весьці інтэрвэнцыю супроць СССР.

Таму трэба ўсёй сацыялістычнай грамадзкасьці і ў першую чаргу Асоавіяхіму, які закліканы да дапамогі мірнаму будаўніцтву і абароне краю, павысіць клясавую чупасьць, узмацніць пралетарскае кіраўніцтва ва ўсіх арганізацыях, неаслабна сачыць за правядзеньнем выразна - выказанае клясавае лініі ў пытаньнях рэгуляваньня росту арганізацый, падбору кіраўнічых кадраў, рашучага зчышчэньня арганізацый ад усіх клясава-чужых элемэнтаў і бязьлітаснай барацьбы з правааапартуністычнымі скажэньнямі ў рабоце Асоавіяхіму, якія ў свой час былі паказаны ў «Зьвязьдзе».

Усе гэтыя задачы па разгортаньні работы Асоавіяхіму павінны быць пленумам ПС ААХ БССР вырашаны ў духу апошніх дырэктыў нашае партыі і накіраваны да таго, каб яшчэ больш садзейнічаць мірнаму будаўніцтву і ўзмацніць абароназдольнасьць нашага краю.

М. В.

У наваделак, 3-га лютага г.г. в 12-ай гадзіне дня, у памяшканьні Дому Чырвонай арміі адкрываецца

4-ы пленум Цэнтральнага Савету Асоавіяхіму БССР

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Азнаямленьне з пяцігодкай Асоавіяхіму БССР.
2. Аб рабоце ў калгас'ячэйках ААХ.
3. Аб веснавой пасеўнай кампаніі.
4. Аб рабоце ААХ на транспарце.
5. Зацьвярджэньне дэлегатаў на Ўсесаюзны зьезд, згодна норм дадзеных Саюзным Саветам ААХ.

На пленум запрашаецца актыў Асоавіяхіму.

Пленум будзе працаваць 3 і 4 лютага.

Не дапусьціць зрыву

Што выявіў „напёт" ЦК ЛКСМБ і рэдакцыі „Чырвонай Зьмены"

Учора ЦК ЛКСМБ і рэдакцыяй «Чырвонай Зьмены» быў арганізаваны «напёт» лёгкай кавалерыі на цэнтральныя станоўы Менску а мэтай праверыць, як заводзіцца трохмесячнік беларускай культуры.

Цэлы рад цэнтральных устаноў і арганізацый да гэтага часу не распрацавалі пляну правядзеньня трохмесячніка і нават не абмеркавалі гэтага пытаньня. Толькі некаторыя ўстановы зрабілі першыя крокі ў гэтым напрамку. Праўда, гарацкім сэктарам БДВ узьнята пытаньне аб адкрыцьці ў Менску магазыну дзіцячай і юнацкай літаратуры. Абвешаны конкурс на лепшую дзіцячую кніжку, выдаюцца бібліятэчкі з 12-ці кніжак аб будаўніцтве беларускай пралетарскай культуры і пралеткультуры ацменшасьцяй. Разгорнуты прагляд ёй раней выданай прадукцыі па дзіцячай літаратуры з мэтай праверкі, наколькі яна адпавядае новым задачам.

Група пісьменьнікаў працуе над кніжкай «Камсамол аб беларускай пралетарскай літаратуры».

Трэба адзначыць, што Белдзяржвыдавецтва яшчэ зусім мала зрабіла да гэтага часу па правядзеньні трохмесячніка: масавая літаратура прасоўваецца марудна, з кнігарань і бібліятэк не заняты ідэалёгічна вытрыманыя кнігі (напрыклад «Падарож на Новую Зямлю» Зарэцкага і інш.). Літаратуры, якая-б мабілізавала як партыйныя арганізацыі, так і ўсю савецкую грамадзкасьць на барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмам розных колераў, амаль зусім няма. У гэтым напрамку БДВ абмежавалася пакуль што выданьнем трох невялічкіх брашурак.

Пасрэдрабіс, які ў часе трохмесячніка павінен быў перабудаваць усю сваю работу, каб забясьпечыць рабочых клюбы, а таксама і іншыя гарады БССР сацыяльна - каштоўным рэпэртуарам і кваліфікаванымі артыстычнымі сіламі, працуе пастарому. Вельмі часта ў рабочыя клюбы пасылаюцца самыя звычайныя халтурщікі.

НКА абмежаваўся выключна пасылкай на месцы абежніка аб трохмесячніку. НКА ўвогуле нічога не зрабіў па правядзеньні трохмесячніка, нават ня складзены пляны гэтай работы. Настаўніцтва ня прыцягнута да правядзеньня трохмесячніка.

Яшчэ горш абстаіць справа з удзелам прафэсыянальных саюзаў у трохмесячніку. ЦП камунальнікаў зусім не абмеркавала пытаньня аб трохмесячніку.

У ЦП гарбароў зьвярнуліся да лёгкага кавалерыстага тав. Гантмана з просьбай, каб ён растлумачыў ім, што такое трохмесячнік беларускай пралетарскай культуры. У ЦП мэдсанпрацы лічаць, што наогул на трэба праводзіць ніякага трохмесячніка. Радыё-цэнтр у гэтым напрамку таксама бязьдзейнічае. У ЦП саюзу с.-г. і лясных рабочых заяўляюць, што «няма часу займацца трохмесячнікам». Зусім ясна, што такія адносіны да трохмесячніка недапушчальны. Патрэбны безадкладныя адпаведныя меры.

М.

ГОМЕЛЬСКІЯ ПРАРЫВЫ

ТОЛЬКІ АДСУТНАСЬЦЮ САМАКРЫТЫКІ І ЗАЦІСКАМ ЯЕ МОЖНА ТЛУМАЧЫЦЬ БУЙНЕЙШЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАРЫВЫ, ДАПУШЧАНЫЯ Ў ГОМЕЛІ

ДЗЕЙНАСЬЦЬ ГОМЕЛЬСКАЙ АКК ПРЫЗНАНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ

Партарганізацыя Гомельшчыны павінна дакладна вывучыць урокі прарываў і на аснове шырока разгорнутай дзейснай самакрытыкі ўзьняць практычнае выкананьне задач партыі на нябывалую вышыню

За сапраўдную бальшавіцкую самакрытыку

Буйныя прарывы і памылкі Гомельскага парткіраўніцтва, выяўленыя абсьледваньнем ЦКК КП(б)Б, заслугоўваюць самае сур'ёзнае ўвагі ўсіх партыйных арганізацый. Гэтыя прарывы сыгналізуюць нам аб тых небясьпечных палітычных зьявах, якія нямінуча ўзьнікаюць пры нявыразным і нездавальняючым разгортаньні дзейснай пралетарскай самакрытыкі і невыстарчальным ажыцьцяўленьні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі,—без чаго немагчыма мабілізацыя ўсіх сіл партыі і рабочае клясы на вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва і поўнае выкарчоўваньне рэштак капіталізму ў нашым краі.

Апублікаваныя ў «Зьвязьдзе» пастановы Гомельскага АК і АКК КП(б)Б з поваду ўхваленых пастаноў прэзыдыумам ЦКК па гэтым пытаньні даюць палітычную ацэнку гэтым памылкам і прарывам.

Што было ў Гомельскай партарганізацыі?

Ня гледзячы на зусім ясныя агульна-партыйныя дырэктывы аб самакрытыцы, ня гледзячы на спэцыяльныя дырэктывы, даныя Гомельскім парторганам з боку Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б яшчэ ў 1928 г., Гомельскае парткіраўніцтва дапусьціла рад грубых палітычных памылак і парушэньняў дырэктыў партыі аб самакрытыцы і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Гэтыя памылкі і парушэньні самым адмоўным чынам адбіліся на стане і рабоце акруговай партарганізацыі

У Гомелі мы мелі выразныя праявы правааапартуністычнай практыкі, калі капіталістычныя элемэнты з санкцыі акрвыканкому і Нова-Беліцкага райкому імкнуліся аўладаць асобнымі вучасткамі самправкаапэрацыі (справа аб пабудове каніфольнага заводу пры дапамозе прыватнага капіталу).

Абсьледваньне Гомельскіх бінорганаў выкрыла ня менш выразныя ўзоры правааапартуністычнай практыкі, як недаабкладваньне кулацкіх гаспадарак, недаабкладваньне прыватнага сэктару, грубыя скажэньні клясавай лініі і яўныя злачынствы ў падатковай практыцы раду раённых органаў, як недаабкладваньне прыслужнікаў рэлігійных культаў, недапушчальнае становішча са спагнаньнем падатку з [illegible] і г. д., і г. д.

У практыцы судовых органаў выкрыты рад фактаў грубых скажэньняў клясавай лініі (па падатковых справах). Суд недаацаніў сацыяльнай небясьпечнасьці супраціўленьня капіталістычных элемэнтаў нашаму пераходу сацыялістычнаму наступленьню і ў цэлым радзе выпадкаў скажаў клясавую лінію мяккімі прысудамі па справах гандляроў і нэпманаў. Гомельскія судовыя органы не разгарнулі рашучай барацьбы з бюракратызмам і цяганінай, з глушыцялямі самакрытыкі. Наадварот, акрсуд і пракуратура сталі на ў корані няправільную, груба памылковую пазыцыю пры правядзеньні ганебных працэсаў супроць рабкораў (справы т. т. Маркава і Мяжэньнікава). Судовыя органы спыняліся на «нямэтазгоднасьці» цэлы рад спраў аб бюракратызьме і цяганіне.

І ў гэты час Гомельская АКК, заслухаўшы даклад пракуратуры, ухваліла яўна апартуністычную рэзалюцыю, у якой моўчкі абышла пытаньне аб клясавай лініі судовых органаў, замяшіўшы канкрэтныя дырэктывы ў гэтым напрамку апартуністычным адвакацкім тэрмінам «аб прававых нормах сялянства».

Нерашучае і нездавальняючае разгортваньне самакрытыкі стварыла спрыяючую глебу для скажэньняў лініі партыі і на радзе іншых вучасткаў работы. Зброя пралетарскай самакрытыкі ня была накіравана супроць тых, хто скажаў лінію партыі ў пацыпытаньні. У арганізацыі мелі месца яўныя скажэньні ў пытаньнях нацыянальных узаемаадносін, калі пад шыльдай барацьбы з антысэмітызмам глушылася самакрытыка, змазваліся праявы яўрэйскага шавінізму (райсаюз). Увага партарганізацыі была нездавальняюча мабілізавана на барацьбу з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. Нерашуча выконваліся дырэктывы партыі аб беларусізацыі. У цэлым радзе выпадкаў не праводзілася барацьба са скажэньнямі нацыянальнай палітыкі партыі, якія пасілі яўна вялікадзяржаўны русацэнтрычны характар.

Абсьледваньне выявіла недапушчальныя факты сямейнасьці і кругавое парукі, у выніку чаго асобныя партыйцы, ня годныя быць членамі партыйных кіраўнічых органаў, трапілі ў члены бюро акруговага камітэту партыі (справы Хяромінскага і Касавога). Аб кампрамэтуючых матар'ялах на гэтых партыйцаў у Гомелі доўга змазвалі пытаньне і толькі ў прысутнасьці камісіі ЦКК было вырашана пытаньне аб выводзе гэтых партыйцаў са складу бюро акруговага партыі.

Дзе хаваюцца прычыны гэтых буйных і грубых скажэньняў у практыцы Гомельскай арганізацыі КП(б)Б?

Яны заключаюцца ў тым, што, ня гледзячы на выразныя дырэктывы вышэйшых парторганаў аб самакрытыцы, у Гомельскай партарганізацыі сапраўдная дзейсная самакрытыка, ня гледзячы на асобы, была разгорнута зусім нездавальняюча. Кіраўніцтва Гомельскай партарганізацыі ня здолела [illegible] партыі аб самакрытыцы і праводзіла ў гэтым пытаньні нявыразную лінію.

У Гомелі мелі месца факты, калі за рэзкую і правільную крытыку праяў правага апартунізму на практыцы штучна прышываліся ўхілы. Калі ячэйка чыгуначнага палка выступіла з рэзкай крытыкай правааапартуністычнай лініі Нова-Беліцкага райкому партыі (справа аб пабудове каніфольнага заводу), то сакратар АК КП(б)Б тав. Малаковіч на пленуме акругкому (лістапад 1929 г.) абвінаваціў ячэйку і сакратара ячэйкі ў «левых заскоках». Гэта зьяўляецца выразным фактам грубага парушэньня прынцыпаў унутрыпартыйнай дэмакратыі.

Бюро АК і прэзыдыум АКК ня здолелі своечасова выправіць няправільнае выступленьне сакратара АК. Скліканы 31 сьнежня актыў трох раённых арганізацый па пытаньнях самакрытыкі «па незалежных акалічнасьцях» да гэтага дня застаўся няскончаным. Такая пазыцыя АК і АКК у пытаньнях самакрытыкі пралівае сьвятло на цэлы рад грубых палітычных памылак пры вырашэньні рабкораўскіх спраў, што прывяло рабкораўскі рух у Гомелі да фактычнага разгрому.

Устаноўка часткі кіраўніцтва наконт «чыстай самакрытыкі», за якую бяспрэчна, з радасьцю прагаласуюць правыя апартуністы, стварыла спрыяючую глебу для расправы над найбольш перадавымі і актыўнымі рабкорамі з боку глушыцеляў самакрытыкі. Замест бязьлітаснай барацьбы з глушыцелямі самакрытыкі, асноўны ўпор быў зроблены на вышукваньне «клясавага ворага» сярод рабкораў, на фактычную барацьбу з перадавой часткай рабкораў.

Узьнік цэлы рад спраў па абвінавачаньні рабкораў у палітычных групоўках, накіраваных супроць парткіраўніцтва і за падрыў вытворчасьці (справа рабкораў сьпіртазаводу і гарбарні). Былі сфабрыкаваны абвінавачаньні рабкораў у хуліганстве і чубараўнічынае (справа рабкораў Маркава і Мяжэньнікава). З мэтай дыскрэдытацыі рабкораў супроць іх штучна фабрыкаваліся беспадстаўныя абвінавачаньні ў антысэмітызьме (справа рабкора Гаўрылава). Такія недапушчальныя і ганебныя мэтады ўмываліся для барацьбы з рабкорамі, а гэта значыць і для глушэньня самакрытыкі. У Гомелі справа дайшла нават да таго, што рабкоры імкнуліся пакончыць самагубствам (справа рабкора Ліндэнбаўма).

Нявыразная лінія АК і АКК у пытаньнях самакрытыкі адбілася на практыцы газэты «Полесская Правда». Газэта з-за боязьні «левых загібаў» і «перахлістваньняў» аказалася нездольнай сьмела і рашуча паставіць рад баявых пытаньняў па барацьбе з правааапартуністычнымі скажэньнямі, па сапраўдным разгортваньні самакрытыкі, ня гледзячы на асобы.

Такая сьціслая характарыстыка тых буйнейшых памылак і прарываў у пытаньнях самакрытыкі, якія дапушчаны кіраўніцтвам Гомельскай арганізацыі, [illegible] раз падкрэсьлівае, куды можа прывесьці нерашучае і нездавальняючае выкананьне дырэктыў партыі аб крытыцы і самакрытыцы, яны яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваюць патрэбнасьць упарта, настойліва і бязьлітасна змагацца з усялякімі найменшымі скажэньнямі баявога бальшавіцкага лёзунгу партыі аб разгортваньні дзейснай пралетарскай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы.

Гомельская партарганізацыя павінна зрабіць палітычныя вывады з усіх гэтых фактаў. **Партарганізацыя павінна шырока абмеркаваць і вывучыць дапушчаныя прарывы і памылкі з тым, каб выправіць іх у сваёй далейшай практычнай рабоце і ўзьняць бальшавіцкую пралетарскую самакрытыку на нябывалую вышыню.**

Аб парушэньнях самакрытыкі ў пастановах Гомельскай АКК КП(б)Б

(СПРАВЫ РАБКОРАЎ СЬПІРТАЗАВОДУ: ДУБАВА, МАРКАВА, КРЫШТАФУНА, ЗАІКІ, ГАЎРЫЛАВА; ЗАЛІНЕЙНАГА І РЭЧЫЦКАГА РАЁНАЎ І ІНШ.)

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

Заслухаўшы паведамленьне камісіі ЦКК па абсьледваньні ГОМЕЛЬСКАЙ АКК аб радзе грубых парушэньняў самакрытыкі ў пастановах АКК-РСІ, якія выразіліся ў тым, што:

а) пры разглядзе ў прэзыдыуме АКК вываду камісіі па рассьледваньні кляпетыўнай заметкі групы рабочых—членаў партыі ячэйкі СЬПІРТАЗАВОДУ аб недахопах на заводзе,—прэзыдыум неўгрунтавана вынес суровае спагнаньне падаўшым заяву, не асудзіўшы паводзін камісіі АКК і бюро Нова-Беліцкага РК, якія правялі пастанову аб выключэньні іх з партыі, нібыта за групоўку і проціпастаўленьне сябе бюро ячэйкі, праявіўшы гэтым зусім някрытычныя адносіны да абмяркоўваемага пытаньня;

б) пры разглядзе заявы рабкораў ЗАЛІНЕЙНАГА раёну яшчэ ў пачатку году АКК-РСІ, ня гледзячы на наяўнасьць момантаў, якія сыгналізуюць зьявішча зацiску самакрытыкі, прыняла пастанову, якая фактычна змазала пытаньне, што ў далейшым пры рассьледваньні гэтае справы зноў камісіяй АК і АКК было прызнана ў пастанове бюро АК і прэзыдыуму АКК;

в) у справе аб ганеньні на рабкора КРЫШТАФУКА («Рухавік Рэвалюцыі») АКК дапусьціла цяганіну і няпрыняцьце своечасовых мер да збароны рабкора ад ганеньня за самакрытыку, не скасавала своечасова няправільнай пастановы райкому і вывадаў камісіі АКК, і толькі праз доўгі час па тых-жа матар'ялах прыняла пастанову, накіраваную супроць глушыцеляў самакрытыкі;

г) у справе аб ганеньні на рабкора МАРКАВА (лесазавод «Калектыўная праца»), АКК, хоць і ўзяла пад абарону рабкора, аднак прыняла нявыразную і нерашучую пастанову і ў далейшым не зацікавілася крымінальнай справай па хлусьлівым абвінавачаньні Маркава, якое насіла характар прасьледваньня за яго рабкораўскую дзейнасьць;

д) пры разглядзе пастановы РЭЧЫЦКАГА РК у адносінах артыкулу тав. СМАЛЯКОВА ў «Полесской Правде» аб т. Фрэйдліну і недахопах у Рэчыцкай арганізацыі, Гомельская АКК належным чынам не рэагавала на недапушчальную пастаноўку райкомам пытаньня аб прыцягненьні да адказнасьці рэдакцыі «Полесской Правды» і на такое-ж недапушчальнае абгаварэньне і пастанову актыву фабрыкі «Дняпро» па гэтым-жа пытаньні, якая пастанова была скасавана прэзыдыумам АКК у лістападзе месяцы 1929 году;

е) у справе члена партыі ГАЎРЫЛАВА АКК дапусьціла няправільны і супярэчлівы пёзунгу партыі аб самакрытыцы падыход, калі аснoўным абвінавачаньне ў аўтарстве заметак, нібыта накіраваных да дыскрэдытацыі кіраўнікоў, якія ў сапраўднасьці выяўлялі недахопы райсаюзу. У асаблівасьці недапушчальным з боку АКК у гэтай справе зьяўляецца тое, што АКК ня толькі не дала адпору недапушчальным выступленьням у ячэйцы райсаюзу ў напрамку абмежавальнага разуменьня самакрытыкі, але ў супярэчнасьці з сапраўднымі фактамі—абвясьціла, што заметкі тав. Гаўрылава не пацьвердзіліся;

ж) пры расьсьледваньні заметкі карэспан дэнта «Полесской Правды» т. ЗАІКА («Не постижимая логика») РСІ, пры выясненьні пастановы аб звальненьні яго з работы ў страхкасе, не расьсьледавала дакладна ўсёй гэтай справы і ў пастанове сваёй дапусьціла рад няправільных фармулёвак, якія не адпавядаюць прынцыпам самакрытыкі (патрабаваньне папярэдняй праверкі заметак, абвяшчэньне недапушчальным самога факту зьмяшчэньня заметкі і г. д.);

з) у справе рабкора ДУБАВА (гарбарня) АКК праводзіла няправільную лінію, якая выразілася ў нявернай ацэнцы стану парт. праф. работы на заводзе, у недапушчальнай пастанове аб звальненьні беспартыйных рабочых з заводу, наданьні выступленьню Дубава на канфэрэнцыі саюзу характару палітычнай дэклярацыі. АКК у гэтай справе ня ўлічыла і сапраўднай абстаноўкі на заводзе і сваёй няправільнай пастановай аб'ектыўна выклікала ўзмацненьне элемэнтаў зацiску самакрытыкі і дала магчымасьць скарыстаньня звальненьня Дубава, у якасьці пагрозы за самакрытыку.

Ня гледзячы на тое, што яшчэ мінуламу складу АКК у дырэктыўных паказаньнях ЦКК па радзе спраў (справы рабкораў МАЛАСТОЎКЕРА, ЛЮБІНА) былі даны вычарпальныя паказаньні аб рашучай барацьбе з парушэньнямі самакрытыкі і прызнаючы, што Гомельская АКК ня ўлічыла належным чынам дырэктывы ЦКК, дапусьціла рад новых памылак і праявіла слабасьць у барацьбе за самакрытыку, прэзыдыум ЦКК пастанаўляе:

1. АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ ПРЭЗЫДЫУМУ АКК ЗА ДАПУШЧАНЫЯ ПАМЫЛКОВЫЯ ПАСТАНОВЫ, ЯКІЯ СЬВЕДЧАЦЬ АБ НЕРАШУЧАСЬЦІ АКК У БАРАЦЬБЕ З ПАРУШЭНЬНЯМІ ЛЁЗУНГУ ПАРТЫІ АБ САМАКРЫТЫЦЫ.

2. З ПРЫЧЫНЫ ТАГО, ШТО САКРАТАР АКК ТАВ. КЛІМЕНКА Ў РАДЗЕ СПРАЎ І Ў АСАБЛІВАСЬЦІ Ў СПРАВЕ СЬПІРТАЗАВОДУ, ЧЛЕНАМ ЯЧЭЙКІ ЯКОГА ЁН ЗЬЯЎЛЯЎСЯ, ПРАЯВІЎ НЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ДА ПРАВІЛЬНАГА АРЫЕНТАВАНЬНЯ Ў ПЫТАНЬНЯХ САМАКРЫТЫКІ, — ПРАПАНАВАЦЬ АКК АБГАВАРЫЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ МАГЧЫМАСЬЦІ ДАЛЕЙШАЙ РАБОТЫ ТАВ. КЛІМЕНКА Ў ЯКАСЬЦІ САКРАТАРА І ЧЛЕНА ПРЭЗЫДЫУМУ АКК.

3. ЗАЦЬВЕРДЗІЦЬ ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ КАМІСІІ ЦКК ПА СПРАВА—Т.Т. ГАЎРЫЛАВА, МАРКАВА, ЗАІКІ, ДУБАВА І ЧЛЕНАЎ ЯЧЭЙКІ СЬПІРТАЗАВОДУ ВЯСЕЛАВА КАЧАНОЎСКАГА І ФРЫДЛЯНДЗРА.

4. ПРЫНЯЦЬ ДА ВЕДАМА ПАСТАНОВУ ПА СПРАВЕ АБ ЗАЦІСКУ САМАКРЫТЫКІ Ў ЗАЛІНЕЙНАЙ І РЭЧЫЦКАЙ АРГАНІЗАЦЫЯХ.

5. Пастанову апублікаваць у друку.

АСОБНА: Прызнаць, што пры разглядзе справы Гаўрылава члены ЦКК т. т. Гініякевіч, Юргенсон і Валынец не ўстанавілі памылковасьці пастановы АКК і гэтым затрымалі своечасовае рэагаваньне ЦКК на памылку Гомельскай АКК.

Паход супроць рабкора

Як цкавалі тав. Крыштафука

Справа гомельскага рабкора тав. Крыштафука ўжо асьвятлялася на старонках «Зьвязды» (гл. «Зьвязду» ад 23 сьнежня 1929 г.). Але некаторыя новыя акалічнасьці гэтае справы прымушаюць нас зноў вярнуцца да яе. Зьмест і гісторыя гэтае справы выразна сьведчаць аб тым, наколькі парткіраўніцтва Гомельскай арганізацыі ня здолела своечасова рашуча і рэзка даць па руках глышыцелям самакрытыкі, якія зьдзекваліся і цкавалі тав. Крыштафука за яго рабкораўскую дзейнасьць.

Тав. Крыштафук, рабочы ад варштату, камуністы, працуючы на гомельскім заводзе «Рухавік Рэвалюцыі», як рабкор, разгарнуў жорсткую барацьбу з усялякімі скажэньнямі і непаладкамі ца вытворчасьці, з прагульшчыкамі, рвачамі і п'яніцамі, з глушыцелямі самакрытыкі і г. д. З 1921 г. тав. Крыштафук пісаў у «Полесскую Правду», «Труд» і інш. газэты. У сваіх заметках тав. Крыштафук рэзка крытыкаваў прарывы ў практыцы заўкому заводакіраўніцтва, антыпралетарскія паводзіны асобных рабочых і інш. Зусім зразумела, што ў сувязі з рабкораўскай дзейнасьцю тав. Крыштафука, у адказ на яго сьмелыя і рэзкія заметкі, «пакрыўджаныя» крытыкай асобы пачалі помсьціцца яму. Аднак, ні бюро партыйнай ячэйкі, ні раённы камітэт партыі не дапамагалі тав. Крыштафуку і ён у адзіноцтве змагаўся з усялякімі скажэньнямі правільнае лініі і канкрэтнымі носьбітамі гэтых скажэньняў. Больш таго, калі т. Крыштафук у сваёй заметцы у «Полесской Правде» рэзка раскрытыкаваў антыпартыйныя, антыпралетарскія паводзіны старшыні заўкому Страшэўскага, майстра Літачэўскага і члена заўкому Лысенкі, раённы камітэт партыі ўхваліў пастанову якая ў сваім зьмесьце, па сутнасьці, была накіравана супроць тав. Крыштафука. Страшэўскі, Лысенка і Літачэўскі, раскрытыкаваныя тав. Крыштафуком за п'янства ў дзень 1-га мая, падалі заяву ў раённы камітэт партыі. Раённы камітэт партыі ўхваліў пастанову, прасякнутую думкай аб тым, што Крыштафук займаецца «склочніцтвам», што пры паўтарэньні ў далейшым такіх фактаў трэба будзе рубам паставіць пытаньне аб партыйнасьці Крыштафука. І гэта ў той час, калі ўся заметка тав. Крыштафука цалкам і поўнасьцю адпавядала сапраўднасьці, калі раённаму камітэту партыі праз некаторы час прышлося на падставе фактаў, паказаных у заметцы, прыцягнуць Страшэўскага, Лысенку і Літачэўскага да партыйнай адказнасьці.

Запкаваны тав. Крыштафук ня раз зварочваўся па дапамогу ў райком КП(б)Б. Але сакратар РК тав. Лісковіч замест абароны унарта заяўляў, што на заводзе склочніцтва, што Крыштафук піша вельмі рэзкія заметкі, і г. д.

Тым часам, у сувязі з рэзкімі заметкамі тав. Крыштафука, накіраванымі супроць нядбайнасьці і памылак заводакіраўніцтва і заўкому, наўкола яго паступова стваралася напружаная і нецярпімая абстаноўка. Рабочыя, якія добра ведалі тав. Крыштафука, як былога чырвонагвардзейца і партызана, прыкладнага рабочага і камуністага, напярэджвалі тав. Крыштафука аб ганебных і недарэчных чутках. Тав. Крыштафук на раз хадаў у АКК РСІ, у акруговы камітэт партыі і патрабаваў, каб усе гэтыя чуткі былі безадкладна расьсьледваны. На ўсе свае шматлікія заявы тав. Крыштафук не атрымаў ніякага адказу. У АКК яго супакойвалі, упэўнялі.

Цкаваньне тав. Крыштафука ласягнула свайго апагею, калі ў справу адкрыта ўмяшаўся дырэктар Дворкін. Ён, больш ад усіх закрануты выкрываўчымі заметкамі тав. Крыштафука, пры дапамозе заведама ілжывых вестак, наглае хлусьні і абураючых інсынуацый, паставіў перад сабою мэту дыскрэдытаваць тав. Крыштафука ў вачох рабочае масы. На раённай партканфэрэнцыі Дворкін, на падставе ілжывых фактаў, не падаючы ніякіх канкрэтных прыкладаў, выступіў супроць тав. Крыштафука з ганебнымі і паклёпніцкімі абвінавачаньнямі.

На агульным сходзе рабочых, дае абмяркоўваўся даклад дырэктара аб выкананьні вытворчых прапаноў рабочых тав. Крыштафук выступіў з правільнай і рэзкай крытыкай недахопаў, дапушчаных заводакіраўніцтвам. Абураны Дворкін, у прысутнасьці ўсіх рабочых заводу, пры дапамозе безпадстаўных і ілжывых абвінавачаньняў зганьбіў тав. Крыштафука. Тав. Крыштафук зьявярнуўся на другі дзень з заявай у АКК-РСІ, але зноў не атрымаў ніякага адказу.

Тав. Крыштафук, не атрымаўшы ніякае дапамогі з боку АКК і раённага камітэту партыі, зацкаваны глушыцелямі самакрытыкі ў асобе Дворкіна і інш., прымушаны быў спыніць сваю рабкораўскую дзейнасьць. Аднак, Дворкін не супакоіўся. У часе чысткі тав. Крыштафука, у сувязі з яго ад'ездам на курсы КП(б)Б, дырэктар Дворкін пры дапамозе правакацыйных прыёмаў, імкнуўся зганьбіць і дыскрэдытаваць тав. Крыштафука, як члена партыі.

А хто-ж такі Дворкін, які цкаваў і зьдзекваў з тав. Крыштафука? Дворкін былы фабрыкант, які меў да рэвалюцыі ўласны завод. Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі Дворкін меў буйную ўласную саматужную майстэрню з уласнымі рабочымі. Да таго часу, пакуль Дворкіну ўдалося нейкім чынам трапіць у рады партыі, ён быў меншавіком.

І вось гэты былы заводчык і меншавік бяскарна цкаваў перадавога і актыўнага рабкора - камуністага. А АКК і раённы камітэт партыі стаялі ў ролі нямых наглядальнікаў і ня выступілі своечасова ў абарону тав. Крыштафука. Яго заява 8 месяцаў валялася без усялякага вырашэньня ў нэтрах пратакольнае Кантрольнае Камісіі. І толькі ў красавіку 1929 году былі прыняты арганізацыйныя меры ў адносінах Дворкіна і інш., якія цкавалі тав. Крыштафука. Зусім правільна зрабіў прэзыдыум ЦКК, калі ў сваёй спэцыяльнай пастанове адзначыў, што АКК не прыняла своечасовых мер і дапусьціла цяганіну ў аборне рабкора ад ганеньня за самакрытыку. Мы пьвёрда ўпэўнены, што чыстка ячэйкі заводу «Рухавік Рэвалюцыі» да канца выкрые тых глушыцеляў самакрытыкі, якія цкавалі тав. Крыштафука. Мы лічым, што глушыцель Дворкін будзе пакараны па заслугах.

Г.

ВЕСНАВАЯ СЯЎБА--СУР'ЁЗЬНЕЙШЫ ЭКЗАМЭН ДЛЯ НАШЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Марудна і непаваротліва рыхтуюцца да важнейшай палітычнай кампаніі

Прамова т. ГАНТМАНА на сэсіі савету Калгасцэнтру БССР

У рабоце нашых арганізацый пішчэ няма належнага зруху

Таварышы, адным з нездаровых пытаньняў, падрыхтоўкі да сяўбы зьяўляецца пытаньне аб неадпаведнасьці эмпаў работы нашых арганізацый з задачамі, высунутымі бурным калгасным рухам. Трэба проста сказаць, што та сёньнішні дзень рух, які мы маем уніе на лініі калектывізацыі, перахліствае цэлым радзе выпадкаў нашы арганізацыі: і калгасныя аб'яднаньні і ўсе іншыя аб'яднаньні с.-г. кааперацыі.

У гэтым, мне думаецца, заключаецца зьўная небясьпека, якую мы павінны перамагчы ва што-б там ні стала.

Таварышы, што выступалі па дакладу т. Дубіны, у значнай частцы падкрэсьлівалі тыя-ж самыя недахопы, якія мелі месца год, таму назад. І год і два таму назад абвінавачвалі сыстему с.-г. кааперацыі. Белсельсаюз у тым, што сваячасова не давалі ўказаньняў, спазьнялася насеньне і мінэральнае ўгнаеньне, якія прыбывалі пасьля сяўбы і г. д. Сёньня мы чуем тыя-ж самыя абвінавачаньні, і сур'ёзных такіх зрукаў у рабоце як Паляводсаюзу, так і ўсіх іншых відаў с.-г. кааперацыі мы ня маем. Не перабудаваўся яшчэ, як належыць, апарат як тут, так і на месцах. Між тым, часу засталося мала, а работы надта многа.

Падрыхтоўка да сяўбы ідзе нездавальняюча

Трэба сказаць, таварышы, проста, што мы да выразьненьня цэлага раду мерапрымстваў, цэлага раду задач, якія пастаўлены партыяй, урадам у сувязі з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы, толь і прыступаем. І тут я-б хацеў папярэдзіць некаторых т. т., якія выступалі ў пачатку т. Дубіны і таварышы б тым, што ня так ужо кенска абстаіць справа на месцах, як гэта малюецца, што сапраўды справа абста

ЗАМЕСТ 11,7 ПРОЦАНТАЎ ТОЛЬКІ 5

4.000.000 РУБ. СТРАЦІЛА ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ ЗА ПЕРШЫ КВАРТАЛ—

З ПРЫЧЫНЫ НЕВЫСТАРЧАЛЬНАГА ЗНІЖЭНЬНЯ САБЕКОШТУ ПРАДУКЦЫІ

ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ Ў ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ, НАГНАЦЬ ПРАПУШЧАНАЕ Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ

З першага месца на апошняе

(Фабрыка абутку, Менск)

За першы квартал бягучага гаспадарчага году менская фабрыка абутку недавыканала свой прамфінплян на 16 в палов. проц. Замест 135.800 пар абутку, вызначаных плянам, фабрыка выпусьціла толькі 113.436 пар. Сабекошт прадукцыі зьніжаны на 3.4 проц. замест 8,8 проц., вызначаных плянам.

Прадукцыйнасьць працы на фабрыцы павінна была быць паднята на 19 проц., фактычна-ж прадукцыйнасьць працы засталася на тым-жа ўзроўні, на якім яна была спачатку году. Такім чынам, фабрыка ня справілася з пастаўленымі перад ёю задачамі. Між тым, фабрыка заўсёды была на першым месцы ў адно сінах да выканаьня прамфінпляну. У мінулым годзе прамфінплян быў значна перавыкананы фабрыкай. Чым-жа тлумачыцца недавыкананьне пляну ў першым квартале бягучага году?

Адміністрацыя паказвае на тры асноўныя прычыны. **Першая прычына**—тое, што Белскуртрэст перанёс штампавальнае аддаленьне менскай фабрыкі абутку ў Віцебск. Такім чынам, фабрыка пачала атрымліваць падэшву, усьцілкі, задкі, абсацы і інш. паўфабрыкаты з Віцебску. У першыя два месяцы— кастрычнік і лістапад—Віцебск неакуратна забясьпечваў фабрыку гэтымі паўфабрыкатамі. Патрэбнасьць фабрыкі значна перавышала забесьпячэньне паўфабрыкатамі з боку віцебскай фабрыкі.

Другая прычына—адсутнасьць належнай колькасьці канылоў. Даўно ўжо фабрыка заказала на Ржаўскай капылоўні фабрыцы дадатковы камплект капылоў. Аднак, з-за памылкі ўсесаюзнага Скурсындыкату, Ржаўская фабрыка прыслала менскай фабрыцы абутку капылы не таго разьмеру, які быў заказаны. Прышлося заказаць іншыя капылы, а пакуль што ў іх адчуваецца яшчэ і зараз вялікі недахват.

Трэцяя прычына—пераабсталяваньне фабрыкі. На працягу першага кварталу на фабрыцы было ўстаноўлена новае абсталяваньне, уведзена канвэерная сыстэма. Фабрыка перайшла на бесьперапынку. У сувязі з гэтым прынята на фабрыку **новых 350 рабочых**. Пераважная частка гэтых рабочых абсалютна не кваліфікаваная, ня ведае ўмоў работы на механічнай вытворчасьці. Гэтыя рабочыя, зразумела, не даюць тэй прадукцыйнасьці працы, якую даюць старыя рабочыя.

Як абстаіць справа зараз? Калі за сьнежань фабрыка дабілася значнага пералому ў бок выкананьня праграмы (плян за сьнежань выкананы на 102 проц., прадукцыйнасьць працы за гэты месяц узьнята на 16 проц.), то за першы месяц другога кварталу прамфінплян **недавыкананы на 5 проц.** Замест 60.000 пар абутку, якія павінны былі быць выпушчаны за студзень, выпушчана толькі 57.000 пар. Праўда, праграма выпуску прадукцыі паступова ўзрастае (у кастрычніку—1.600 пар, у лістападзе—1.800 пар, сьнежані—1.800, у студзені—2.000 пар у дзень і г. д.). Прытакі недахваты капылоў, з якімі змагаецца фабрыка павінна атрымаць новыя тры тысячы пар капылоў тады, паводле слоў адміністрацыі, работа пойдзе поўным тэмпам.

Вялікі ўплыў на выкананьне праграмы маюць **прагулы**. Яны ў сярэднім складаюць **10 проц.** Сюды ўваходзяць, праўда, і прагулы па «грунтоўных» прычынах. На фабрыцы, пры перазаключэньні калдагавору, група рвачоў імкнулася сарваць прадукцыйнасьць працы. Гэта група была выкрыта, два з іх былі зьняты з работы. Аднак, трэба сказаць, што некаторыя органы чамусьці абараняюць рвачоў. Так, менская акрпракуратура дамагаецца аднаўленьня на рабоце галоўнага ініцыятара групы рвачоў Альпяровіча. І гэта, ня гледзячы на тое, што са зьніцьцем з работы гэтых двух чалавек згадзілася РСІ.

Г.

Зводка з фабрык і заводаў

Заданьне па зьніжэньні сабекошту за першы квартал бягучага гаспадарчага году ня выканана. Замест зьніжэньня сабекошту за ўвесь год на 11.7 проц., першы квартал па ўсёй прамысловасьці дае зьніжэньне сабекошту ўсяго на 5 проц. у сярэднім. Гэта стварае грозную пагрозу выкананьню пляну капітальнага будаўніцтва.

Выкананьне пляну адными прадпрыемствамі і невыкананьне другімі пры амаль аднолькавых умовах работы для ўсёй прамысловасьці гаворыць аб сур'ёзным прарыве ў рабоце значнай частні прадпрыемстваў. Кіраўніці якіх на вдолесі ў належнай ступені папярэдзіць арганізацыйна-тэхнічныя непаладкі, што адмоўна адбіваюць на рабоце прамысловасьці.

Далёка не на вышыні аказаліся і нізавыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, якія ў аднолькавай ступені мясуць адказнасьць за выкананьне асноўных дырэктыў прамфінпляну.

Не толькі выканаць, але і перавыканаць прамфінплян, зьнішчыць прарыў, які стварыўся ў першым квартале—вось баявая задача прадпрыемстваў, што адстаюць.

Выкананьне гэтай задачы зьявіцца лепшым экзаменам ня толькі для кіраўнікоў прадпрыемстваў і партыйных і прафсаюзных арганізацый, але і для ўсяго калектыву рабочых.

Ніжэй мы падаем лічбы, якія адлюстроўваюць становішча са зьніжэньнем сабекошту прадукцыі на нашых прадпрыемствах за першы квартал.

Працуюць добра

	Плян	Выкананьне
Гута „Камінтэрн"	7,14%	10,77%
Гута „Ільліч"	5,97	8.6
Панчошная фабрыка	8	11,7
Гарбарня імя Лекерта	4	8,3
Гарбарня „Пралетарскі Шлях"	5	7,4
Шпалерная ф-ка імя Вароўскага	10,8	15,5
Гута „Працы"	7,33	7,87
„Камунар"	26	25,5
Дражджавы завод „Вызваленая Праца"	21,5	21,1
„Спартак"	10	9,8

Набліжаюцца да заданьня

	Плян	Выкананьне
Гута «Пралетары»	7,56%	6,72%
Гута імя Домбаля	11	8,82
Дражджавы—«Пралетары»	14,4	10,2
Папяровая—«Чырвоная Зорка»	12,5	9,4
Кардонная—імя Левіна	16	12,2

Працуюць дрэнна

	Плян	Выкананьне
Гута «Ноўка»	17,2%	3,1%
Швейная—імя Валадарскага	10,6	3,56
Абутковая—у Гомелі	20	2,1
Віцебская шчацінная	9,4	2,4
Запалкавая—«Дняпро»	13,6	4,6
Запалкавая—«Х Кастрычнік»	14,2	4,2
Запалкавая—«Вэвуі»	10,6	2,6
Махорачная ф-ка	6,2	0,6
«Гэрой Працы»	12,1	3,5
Кардонная—імя Сталіна	14	1,8

Адстаюць

	Плян	Выкананьне
Гута «Кастрычнік»	13,7%	8,9%
«Энергія»	16,8	12
Гомельскі «Пралетары»	16,6	8,1
«Рухавік Рэвалюцыі»	3,8	2,6
«Інтэрнацыянал»	7,22	5,4
Галянтарэйная—«Беларуска»	18,6	14,8
Швейная—«Кастрычнік»	12,6	8
Швейная—«Прафінтэрн»	8,2	5,2
Швейная—«Камінтэрн»	9	7,86
«Бальшавік»	11,6	5,75
Гарбарня ў Віцебску	8	4,2
Менская абутковая	9,7	4,46
Віцебская абутковая	11,7	5,8
«Чырвоная Бярэзіна»	9,8	4,4
«Чырвоны Хімік»	18	13,3
«Чырвоная Зара»	6,2	4,3
Маслабойны—імя Калініна	6,6	3,33
Маслабойны—імя Альярыха	3,68	2,2
Папяровая—«Прафінтэрн»	19	8,3
Кардонная—імя Вароўскага	16	6,4
Палеграфкомбінат	29,3	16,7

На чорную дошку

	Плян	Выкананьне
«Чырвоны Металісты»	13,1%	на 0,2 паве. лічб.
Цьвіковы—«Чырвоны Кастрычнік»	6,9	на 0,3 паве. лічб.
Маслабойны—«Зара»	6	на 0,2

Ня маюць яшчэ вестак

Амаль усе заводы дрэваапрацоўчай прамысловасьці, акулярная фабрыка, менская, гомельская і бабруйская шчацінныя фабрыкі, віцебскія воласа прадзільная і шчотачная, а таксама ўсе прадпрыемствы тэкстыльтрэсту.

Яшчэ няма дакладных вестак

(Гута „Пралетары", Менск)

У першым квартале бягучага году гута недавыканала прамфінплян на 10,4 проц. па вазе і на 4,8 проц. па цане. Паводле пляну было вызначана выпусьціць за першы квартал 686 тон рознага шкла на суму 208 тыс. руб. Выпушчана-ж усяго 615 тон на суму 189 тыс. руб.

За першы месяц другога кварталу (студзень), паводле слоў адміністрацыі, назіраецца пералом у бок выкананьня вызначанага пляну. Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з першым кварталам мінулага году павялічылася. Зараз, на жаль, яшчэ няма дакладных вестак аб колькасьці выпушчанай прадукцыі за студзень. Аднак, паводле арыентовачных даных, можна з упэўненасьцю сказаць, што плян, вызначаны на гэты месяц, выкананы.

Трэба адзначыць, што адміністрацыя дрэнна інфармуе рабочых аб ходзе сацыялістычнага спаборніцтва на заводзе. Замест таго, каб вывешваць вынікі спаборніцтва за кожныя 15 дзён, адміністрацыя вывешвае іх толькі 5-6 кожнага месяца. Так, за першую палову студзеня весткі аб ходзе сацспаборніцтва ня вывешаны.

Г.

Сацспаборніцтвам ня цікавяцца

На ўрачыстым пасяджэньні, прысьвечаным тыдню інжынэра і тэхніка, інжынэр Белдзяржбуду вельмі падрабязна гаварыў аб увязцы работы ІТР з працаю рабочае масы. Пытаньні ўдзелу інжынэраў і тэхнікаў у рабоце ударных брыгад, у правядзеньні сацспаборніцтва і інш. занялі значнае месца ў яго дакладзе. Што-ж практычна зроблена ў зьвязку з тыднем інжынэра і тэхніка? Вельмі мала. На пабудове універсытэцкага таралка і Дому ўраду, інжынэрна-тэхнічныя работнікі сябе мала праявілі. Былі арганізаваны два гурткі рабочых па вывучэньні жалеза-бэтоннае і сталярна-цясьлярнае працы, але заняткаў яны так і не расачалі. Работа ўдарных брыгад і ход сацспаборніцтва не зацікавілі нашых інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў. Відавочна, што ІТР па пабудове універсытэцкага таралка адным «тыднем інжынэра і тэхніка» раскалыхоць ня ўдасца.

Г. ДОРСКІ.

Пагроза заводу

(Фанэрны завод „Зьвязда", Капцэвічы)

Капцэвіцкі фанэрна - лесапільны завод «Зьвязда» ў сваёй працы мае вельмі многа недахопаў. Вузкакалейка, па якой падаюцца матэрыялы на завод, расхісталася і часта бываюць такія выпадкі, што пляцформы разам з калодамі звальваюцца з рэек. На вузкакалейцы працуюць два маленькія паравозікі, якія зусім не задавальняюць патрэбы заводу.

Паволле загаду Лесбелу, у Капцэвічы быў перавезены з Пасталоў новы вялікі вузкакалейны паравоз. Але з прычыны папсаванасьці самое вузкакалейкі ў паравозе зламалася вось і ён вышаў са строю. А гэта пагражае спыненьнем заводу—бо няма на чым падвозіць за 10-15 кілёмэтраў лесаматар'ялы. З выцягваньнем калод з Дарашэвіцкага возера справа стаіць таксама вельмі дрэнна. Адміністрацыя-ж на заметкі ў насьценгазэце на ўсю гэтую бесгаспадарчасьць зусім не рэагуе.

РОЧА.

150 рабочых—на праверку выкананьня прамфінпляну

У Менску вылучаны брыгады з 150 рабочых для праверкі па прадпрыемствах выкананьня прамфінпляну за першы квартал 29-30 году.

ВСНГБ прапанаваў усім кіраўнікам трэстаў, прадпрыемстваў і адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу аказаць брыгадам усямерную дапамогу ў правядзеньні гэтай работы.

Ільготы для рабочых-калгасьнікаў

У сувязі з тым, што на некаторых прадпрыемствах наглядаецца непаразуменьні пры выплаце грошай рабочым, якія вылучаны на работу ў калгасы, Наркампрацы даў наступнае растлумачэньне.

— Пасьля сканчэньня курсаў рабочым і работніцам даецца водпуск ня больш 5-ці дзён для падрыхтоўкі да паездкі. Калі адпраўка на месца работы ў калгас затрымліваецца на больш доўгі тэрмін не па віне рабочага, прадпрыемства аплачвае за ўвесь час, выходзячы з сярэдняга заработку.

За тры дні да ад'езду з усімі рабочымі, што ад'язджаюць у калгасы, робіцца поўны грашовы разьлік.

Прадпрыемства выплачвае рабочаму адначасовую дапамогу ў разьмерах месячнага заработку і, акрамя таго, кожны член сям'і атрымлівае ¼ дапамогі рабочаму калгасьніку.

Утрыманцы рабочых, якія накіраваны ў калгасы, маюць права на па-зачарговую насьлку на работу.

Электрыфікацыя раёнаў суцэльнай калектывізацыі

Пры НКЗ арганізаваны сэктар будаўніцтва і сельскай электрыфікацыі. Пад яго кіраўніцтвам будзе працаваць беларускае аддаленьне ўсесаюзнага таварыства Электрасельбуд.

Сёлета па Беларусі пачнуцца работы па сельскай электрыфікацыі на агульную суму звыш 20 мл. руб. На 1929-30 год асигнавана 4.500 тысяч руб.

З найбольш буйных об'ектаў трэба адзначыць пабудову электрастанцыі пры Рагачоўска-Жлобінскім агракамбінаце, электрыфікацыю Ляднянскага агра-камбінату, пабудову электрастанцый у Гроднаве, Хойніка-Брагінскім раёне і на Мар'інскім калфондзе.

Магутнасьць электрастанцыі пры Рагачоўска-Жлобінскім камбінаце вызначана ў 3.000 кілёват. Кошт яе—каля 3 млн. руб. У Хойніка-Брагінскім раёне электрастанцыя ахоліць тэрыторыю ў 40.000 гэкт. мэліяраванай плошчы, на якой арганізуецца саўгас Зернятрэсту.

У Мазырскай акрузе вызначаецца пабудова буйных цёпла-электрацэнтраляў пры дрэваапрацоўчым камбінаце. Гэта станцыя ў першую чаргу дасьць электра-энэргію Капінкавіцкаму і Юравіцкаму раённым суцэльным калектывізацыі. У некаторых мясцох праведзены ўжо рад падрыхтоўчых работ.

Раскулачваньне-складаная частка і вынік суцэльнае калектывізацыі

Ня голым раскулачваньнем, адарваным ад суцэльнае калектывізацыі, а настойлівай работай над узмацненьнем калгасаў, арганізацыяй і павышэньнем прадукцыйнасьці працы будзе нанесены руйнуючы ўдар кулацтву, як клясе.

Умацоўваючы калектывізацыю, ліквідуем кулацтва, як клясу

Весткі з раёнаў, атрыманыя намі за апошнія дні, сьведчаць аб тым, што рад мясцовых арганізацый не зразумеў апошняе дырэктывы партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы. У выніку, пры практычным ажыцьцяўленьні гэтае дырэктывы наглядаецца скажэньне лініі партыі.

Зусім зразумела, што раскулачваньне і абагуленьне кулацкіх сродкаў вытворчасьці мы праводзім на базе суцэльнае калектывізацыі, як складаную частку суцэльнае калектывізацыі раёнаў і округ.

Усякім імкненьням аддзяліць раскулачваньне ад правядзеньня суцэльнае калектывізацыі, а тым больш, падмяніць суцэльную калектывізацыю раскулачваньнем трэба даць самы жорскі і рашучы адпор. Між тым, на мясцох мы ўжо маем факты, калі раскулачваньне праводзілася бяз усякае сувязі з калектывізацыі. Вось факты:

Смалявіцкі раён, Менскай акругі, не зьяўляецца раёнам суцэльнае калектывізацыі. Наадварот, гэты раён у галіне калектывізацыі зьяўляецца найбольш адсталым. Аднак, ня гледзячы па гэта, раскулачваньне праводзіцца нават у тых мясцох, дзе няма калгасаў. Напрыклад, у вёсцы Бабі Лес, Юравіцкага сельсавету, пачалі праводзіць раскулачваньне. Між тым, у гэтай вёсцы калгасу яшчэ не арганізавалі. Аб практычнай рабоце па калектывізацыі, аб мабілізацыі мас на выкананьне **першачарговай** задачы — арганізацыі калгасу тут забыліся і пачалі праводзіць раскулачваньне. Канфіскаваную ў кулакоў жывёлу пагналі за 10 вёрст у саўгас Антаполье і ў калгас у вёсцы Мглё.

Адначасова ў гэтым раёне, у некаторых мясцох, мы наглядаем так званую «гульню ў калектывізацыю». Так, у вёсцы Юрава 29-га студзеня адбыўся сход сялян, на якім абмяркоўвалася пытаньне аб арганізацыі калгасу. Пасьля дакладу сакратара парт'ячэйкі Бужо 113 гаспадарак пастанавілі аб'яднацца ў калгас з жывёлагадоўчым ухілам на плошчы ў 1.000 гэкт.

Статут калгасу на сходзе не абмяркоўваўся.

Сакратар ячэйкі — арганізатар калгасу нічога не сказаў аб патрэбе зараз-жа прыступіць да абагуленьня сродкаў вытворчасьці калгасьнікаў, — жывёлы, інвэнтару і г. д. Увага калгасьнікаў ня была завострана таксама па неабходнасьці барацьбы са зьнішчэньнем жывёлы.

У выніку, з прычыны адсутнасьці ўсякай растлумачальнай работы сярод бядняцка - серадняцкіх мас вёскі на другі дзень пасьля пастановы аб арганізацыі калгасу, сяляне пачалі забіваць сьвіней, рэзаць кароў і распродаваць маемасьць. Мясцовае крэдытнае таварыства замест таго, каб растлумачыць сялянам шкоднасьць іх учынкаў для іх-жа саміх, скупляе ў сялян жывёлу, якая тут-жа забіваецца, тушы перавозяцца ў Менск. За адну ноч было зарэзана больш 10 кароў, ня лічачы сьвіней і цялят і інш.

Сельсавет ніякае барацьбы са зьнішчэньнем жывёлы не вядзе. Некаторыя члены сельсавету, як Смаргоніч Сымон, Шэмпель Паўла першымі парэзалі і прадалі сваю жывёлу.

На заўвазі, чаму гэта так робіцца, сакратар сельсавету Смаргоніч Іван адказаў: «У калгасе такія каровы непатрэбны».

Члены Юравіцкага крэдытнага т-ва на запытаньне, чаму яны дапускаюць убой жывёлы, адказваюць: «Мы яшчэ не атрымалі адносіны аб тым, што нельга забіваць жывёлу».

Вышэй паданыя факты яскрава сьведчаць аб тым, што дырэктыва партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, у радзе месц скажаецца. Ня ўсе мясцовыя арганізацыі зразумелі, што ліквідацыя кулацтва павінна праводзіцца, як складаная частка суцэльнае калектывізацыі.

Аднак, побач з гэтым мы маем факты, калі мясцовыя арганізацыі не ўявілі сабе значэньня патрэбы раскулачваньня ў раёнах суцэльнае калектывізацыі. Ня гледзячы на рад рэзалюцый бядняцка - серадняцкіх мас, якія патрабуюць хутчэйшага раскулачваньня ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, на мясцох часамі злачынна марудзяць, топчуцца на месцы і ня прымаюць рашучых мер супроць кулака, які распродае сваю жывёлу і інвэнтар. Гэта — праяўленьне правага ўхілу на практыцы, гэта — на руку кулаку.

Бяз удзелу бядняцка-серадняцкіх мас

У Калінкавіцкім раёне калектывізавана больш за 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Да вясны гэты раён будзе амаль што спрас калектывізаваны На базе суцэльнай калектывізацыі ў гэтым раёне зараз прыступілі да ажыцьцяўленьня дырэктывы партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы. Гэта работа праходзіць пры актыўным удзеле батрацкой, беднаты і калгасьнікаў.

Але побач з гэтым у некаторых мясцох раскулачваньне праводзіць бяз ўдзелу батрацка-бядняцкіх мас і калгасьнікаў. Так, Суханічкі сельсавет пачаў праводзіць раскулачваньне ў адміністрацыйным парадку.

У Гарошчыцкі сельсавет, Калінкавіцкага раёну прыехаў куставы аграном і заявіў: «Зараз мы праводзім абагуленьне маемасьці тых, што ўступілі ў калгас, а праз некалькі дзён будзем абагуль ваць маемасьць усяго насельніцтва, бо аб гэтым ёсьць сакрэтная пастанова».

Зразумела, што такія выступленьні антысавецкія па сутнасьці, толькі шкодзяць справе калектывізацыі.

Шафаронак.

Ленінскі прызыў ударнікаў

Група рабочых МБВ, якія падалі заявы аб уступленьні ў партыю

МЕНСК

Рабочыя **вагонных майстэрань МБВ** чыг. пераходзяць на ўдарныя тэмпы работы. 4 падсобныя цэхі—механічны, бандарны, кавальскі і такарны абвясьцілі сябе ўдарнымі. 60 рабочых падалі заявы аб прыняцьці іх у партыю, з іх 20 з вялікім вытворчым стажам, аднаму рабочаму—64 гады.

Рабочыя **пасажырскага цэху** абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

Рабочыя, занятыя па пабудовах **клінічнага гарадка БДУ, політэхнікуму і Акадэміі Навук**, заслухаўшы даклад т. Рыжова, абвясьцілі сябе ўдарнікамі.

ГОМЕЛЬ

На станцыі Гомель пасажырская 50 грузчыкаў абвясьцілі сябе ўдарнікамі. На заводзе «Сацыялізм» ва ўдарнікі зарэгістраваліся 35 чалавек. На заводзе **«Капенкі ўная Праца»** арганізавана ўдарная брыгада ў 100 чалавек. **Завод «Рухавік Рэвалюцыі»** поўнасьцю абвясьціў сябе ўдарным, уключаючы адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал, які ўзяў на сябе рад абавязкаў.

Беспартыйны слесар вагоннага цэху заводу імя Лапцэвіча тав. Ю. Камінскі падаў заяву аб уступленьні ў партыю і абяцаў кожны месяц працаваць 4 ударнымі. На карысьць індустрыялізацыі, адлічваць ½ процанту штомесячна на гэту-ж мэту і выклікаў пасьледваць яго прыкладу ўсіх рабочых.

МАГІЛЕЎ

Агульны сход рабочых Магілеўскай гарадзкой электрастанцыі абвясьціў сябе ўдарным і абяцаў выканаць задачы, якія стаяць перад рабочай клясай.

ВІЦЕБСК

Рабочыя заводу «Чырвоны Мэталіст» ухвалілі рэзалюцыю, у якой абяцаюць ЦК партыі прыняць усе захады да выкананьня прамфінпляну. Увесь завод перайшоў на ўдарныя тэмпы работы. За апошнія дні на заводзе 46 рабочых падалі заявы аб прыняцьці іх у партыю.

Абутковая фабрыка імя Лекерта паводле пастановы агульнага сходу рабочых абвешчана ўдарнай.

Піджачны цэх швэйнай фабрыкі №1 у складзе 175 рабочых падаў калектыўную заяву аб уступленьні ў партыю.

Рабочыя **пад'ёмнай майстэрні МБВ** чыгункі усім цэхам падалі заяву аб уступленьні ў партыю.

12 рабочых **фабрыкі імя Бэбэля**, уступаючы ў партыю, далі абяцаньне поўнасьцю выканаць прамфінплян.

На **шчацінной фабрыцы** пасьля мітынгу аб ленінскім наборы ўдарнікаў ад 20 рабочых паступілі заявы аб прыняцьці іх у партыю. На **воласа-прадзільной фабрыцы** падана **6 заяў, на панчошнай—30.**

Па прыблізных вестках большасьць віцебскіх прадпрыемстваў абвясьцілі сябе ўдарнымі. У ленінскія дні 1.500 рабочых падалі заявы аб прыняцьці іх у партыю.

БАБРУЙСК

На бабруйскім **дрэваапрацоўчым камбінаце** ва ўдарныя брыгады запісалася яшчэ 112 чал. Другая зьмена лесапільнага абвясьціла сябе ўдарнай.

Абвясьцілі сябе ўдарнымі перапілёпы і газэтны цэхі бабруйскай друкарні.

С. Будзінскі і Канакоцін О.

Яшчэ адна перамога на літаратурным фронце

Шалёнае супраціўленьне клясавага ворага рашучаму наступленьню сацыялізму, абвостраная клясавая барацьба, якая ідзе ў крэпе разгортваецца і на літаратурным фронце. І тут кулак, які ліквідуецца намі, як кляса, і дробны буржуа з усіх сіл намагаюцца процістаяць перад пралетарскай культурай і літаратурай. Ён—клясавы вораг—час ад часу паказвае свой твар і ў публіцыстычнай і літаратурна-мастацкай творчасьці або непасрэдна праз сваіх агентаў, якім удалося прасякнуць у савецкую літаратуру, або ўплываючы на слабых, няўстойлівых, якія часамі, паміма волі, робяцца яго прадстаўнікамі і выступаюць супроць пралетарскай літаратуры.

У барацьбе на ідэалёгічным фронце пытаньне «хто каго?»—надзвычай вострае пытаньне, і той, хто хоць на хвіліну забывае аб барацьбе на гэтым фронце, той, хто хоць на хвіліну траціць актыўнасьць у барацьбе, нямінуча адыходзіць у бок, і адсюль становіцца мішэнню, якую бяруць пад абстрэл свайго ўплыву клясавыя ворагі. Адыход ад актыўнай барацьбы пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі азначае крок адыходу ад пралетарскай лініі ў бок да буржуазіі, а потым і проста адыход да яе.

Тая пастанова літаратурнага згуртаваньня «Ўзвышша», якая сёньня друкуецца з усёй выразнасьцю гаворыць аб тым, як клясавы вораг, акапаўшыся на гэтым вучастку ідэалёгічнага фронту, імкнуўся сыстэматычна падпарадкаваць дзейнасьць згуртаваньня сваім кулацка - кэпманскім уплывам. Мы бачым, як сярод узвышэнцаў, па меры завастрэньня клясавае барацьбы на вёсцы і ў горадзе, стаўленнікі клясавага ворага робяць усё больш нахабныя і адкрытыя антыпралетарскія, нацдэмакратычныя вылазкі, усё больш умацоўваюць свае пазыцыі ў самым згуртаваньні.

Трэба адзначыць, што большасьць «Узвышша» не ўстаяла пад напорам дробна-буржуазных уплываў. І пачала скатвацца ў балота апартунізму і нацдэмакратызму. Пралетарская крытыка і пралетарская грамадзкасьць своечасова паказвалі на хістаньні пазсобных сяброў гэтага згуртаваньня, папярэджвалі аб небясьпецы тых пазыцый, на якія станавіліся пазсобныя сябры, на якія паступова адыходзіла і ўсё аб'яднаньне. Аднак, узвышэнцы настолькі адыйшлі ад лініі партыі, што ніякія папярэджаньні не даходзілі, ня ўзьдзейнічалі,—тады быў адкрыты бязьлітасны агонь па «Ўзвышшы», па фінягу, на якім клясавы вораг зрабіў прарыў. Перад «Ўзвышшам» былі толькі два шляхі: або застацца на старых пазыцыях і лёгкай барацьбы перайсьці да актыўнай барацьбы супроць пралетарскай ідэалёгіі, або, прааналізаваўшы свае шляхі, на якія яно пайшло і заблыталіся, ды ўсьвядоміўшыся і прызнаўшы памылкі, рэвізаваць сваю лінію, і ажыцьцяўляючы лінію партыі, стаць актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Прызнаньне памылак зьявілася вынікам барацьбы, якая праходзіла ўнутры самога згуртаваньня, барацьбы, якая стымулявалася наступленьнем камуністычнай крытыкі і пралетарскай грамадзкасьці. У выніку гэтага «Ўзвышша» зрабіла рашучы крок адыходу ад дробна-буржуазнай ідэалёгіі і набліжэньня да пралетарскіх пазыцый.

Дэклярацыя «Ўзвышша»—бясспрэчная перамога пралетарскай грамадзкасьці ў барацьбе на ідэалёгічным фронце. Для нас таксама бясспрэчна, што лепшым доведам таго, што дэклярацыя не зьяўляецца манэўрам, а выяўленьнем сапраўднага пералому, будуць зьяўляцца літаратурна-мастацкія і публіцыстычныя творы, наогул уся праца аб'яднаньня «Ўзвышша», якія адлюстроўваюць ня толькі сучасьнасьць, а зьявяцца зброяй у руках пралетарыяту ў сацыялістычнай перабудове краіны, зброяй, якая павінна быць усёй сваёй вастрынёй накіравана супроць клясавага ворага, якая павінна біць па кулаку, па дробнай буржуазіі і па іх ідэалёгах—нацыянал-дэмакратах.

Сёньня трэба адзначыць, што некаторыя крокі ў гэтым напрамку «Ўзвышша» ўжо робіць, але гэта толькі пачатак.

Пралетарская грамадзкасьць упарта змагалася за вызваленьне «Ўзвышша» з палону варожай пралетарыяту ідэалёгіі і яна перамагла ў гэтай барацьбе. Але гэта не азначае, што пралетарская грамадзкасьць: павінна аслабіць крытыку ў адносінах да «Ўзвышша», або пічыць, што карэньні палітычных памылак зусім ліквідаваны.

«Ўзвышша» не павінна забываць ні на хвіліну аб сваіх памылковых установках, якія адбіліся ў яго творчасьці, у яго працы; яно павінна весьці рашучую барацьбу супроць клясавых ворагаў і іх ідэалёгіі, супроць магчымых рэцыдываў сваіх памылак, а сачыць за тым, каб ніхто з сяброў згуртаваньня не падпаў пад уплыў клясавага ворага, рашуча адкідаць здрадніцкую сацыялістычнага будаўніцтва, весьці барацьбу за пралетарскі зьмест літаратуры, быць сапраўдным барацьбітом на фронце ідэалёгічным за гегемонію пралетарскай літаратуры.

Пастанова беларускага літаратурна-мастацкага згуртаваньня „Узвышша"

пра палітычныя памылкі ў літаратурна-публіцыстычнай творчасьці

За тры з паловай гады свайго існаваньня «Ўзвышша» дало цэлы рад выдатных твораў, блізкіх сацыялістычнаму будаўніцтву. Але творчы ў абстаўнах абвостранага клясавага змаганьня, знаходзячыся ў працэсе ператварэньня сялянскай псыхікі ў пралетарскую і пад напорам дробна-буржуазных сіл, згуртаваньне дапусьціла рад палітычных памылак, публічна іх не крытыкавала, што аб'ектыўна адхіляла ад правільнай лініі.

З тых памылак найбольш небясьпечнымі зьяўляюцца.

а) У 1927 годзе у газ. «Гудок» № 114 Ул. Дубоўка ў артыкуле «Ўзвышша», гаворачы пра ўдзел згуртаваньня ў грамадзкай рабоце, пісаў: «З грамадзкай працай «Ўзвышша» і ня думала парываць, спадзяючыся праводзіць яе і надалей пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў магчымым для сябе кірунку і формах».

Гэта зазначэньне—«у магчымым для сябе кірунку і формах»—намі ў друку ня было адкінута, як шкодная і няправільная фармуляваньне нашай установкі ў дачыненьні да кіраўніцтва партыі, бо лічым, што наша як грамадзкая, так і літаратурная праца павінна праводзіцца пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі без усякіх агаворак. Як гэта мы заяўлялі ў «Тэзісах да ўтварэньня «Ўзвышша» і як гэта ня раз паўтаралася намі пазьней у друку і ў публічных выступленьнях.

б) У 1[illegible] «Ўзвышша» ў артыкуле «Ўзвышша» перад новым годам [illegible] пра структуру твораў, адзначана, што іх «яно (Ўзвышша) выдае пад сьцягам творчасьці літаратуры нацыянальнай у форме і пралетарскай у сваёй імкнёнасьці». Гэтае памылковае палажэньне ня было раскрытыкавана і тым самым заціміла адзіна-правільную фармулёўку —нацыянальная па форме і пралетарская па зьмесьце. Гэту няправільную фармулёўку—«... пралетарская па імкнёнасьці»—згуртаваньне адкідвае раз і назаўсёды.

в) У артыкуле Ф. Купцэвіча («Узвышша» № 6 1928 г.) «Аб маністычным разуменьні творчасьці Ц. Гартнага» сказана: «Яшчэ і цяпер канчаткова не разьвязана спрэчнае пытаньне аб мажлівасьці паогул пралетарскай літаратуры, як літаратуры [illegible] пераходнага пэрыяду». Прызнаючы сваю памылку ў тым, што гэта трацкісцкая установка была выдрукавана на старанках «Ўзвышша» і да гэтага часу не раскрытыкавана, згуртаваньне адмяжоўваецца ад яе, як ад няправільнай і шкоднай.

г) У артыкуле Кузьмы Чорнага «Перад другім дзесяцігодзьдзем» сярод некалькіх думак пра будаўніцтва культуры паогул сказана, што «галоўнае на ўсім гэтым працэсе (працэсе ўтварэньня вышэйшых форм культуры)—змаганьне за беларускія формы беларускай культуры (літаратура, тэатр, музыка, жывапісь)». Такое выражэньне пытаньня, якое ігнаруе пралетарскі зьмест, —зацямняе клясавую сутнасьць культуры і зьяўляецца шкодным, бо вядзе да нацыянал-дэмакратычнай установкі.

д) У артыкуле А. Адамовіча «Паўлюк Трус» («Ўзвышша» № 7, 1929 г.) выпукленн нацыяналістычны момант, а таксама дапушчана нетактоўнасьць у тым, што паданы вытрымкі з лістоў нябожчыка, дапушчана абразьлівае выражэньне аб пасрэднасьці. Усё гэта робіць артыкул палітычна шкодным.

Апрача памылак у тэарэтычнай і крытычнай частцы, сябрамі згуртаваньня былі дапушчаны таксама памылкі ў мастацкай творчасьці; галоўнымі з іх зьяўляюцца:

а) У творчасьці Я. Пушчы была згуртована ўсякая рэвалюцыйная пэрспэктыва, што вельмі выразна выявілася ў «Лістох да сабакі», і толькі пры дапамозе марксыцкай крытыкі і крытыкі ўнутры згуртаваньня пачалі прасьвятляцца дэталяды, і Я. Пушча набліжаецца да пралетарскай літаратуры, пра што сьведчыць твор «Сады вятроў».

б) У творчасьці Кляшторнага паэма «Калі асядае муць» і інш. творы—упадніцкія; у іх ня супроцьпастаўлены адмоўнаму станоўчыя бакі, і гэтыя творы як упадніцка-багамоскія, зьяўляюцца шкоднымі.

в) У творы Лужаніна «Случчына» перабольшаны адмоўныя бакі Сапецкай Случчыны, а дадатныя бакі зусім не паказаны і падана гэта ўсё ў востра-сарказтычнай аб

Вытворчае сьвята на заводзе „Дрэваапрацоўшчык“

75 рабочых падалі заявы аб уступленьні ў партыю

Пазаўчора ў доме асьветы адбыўся ўрачысты сход рабочых заводу «Дрэваапрацоўшчык», прысьвечаны пераводу заводу на 7-гадзінны рабочы дзень і на бесьперапынны тыдзень. Разам з гэтым завод урачыста праводзіў рабочых, вылучаных для пастаяннай і часовай работы ў калгасах.

На вечары прысутнічалі ўсе 100 проц. рабочых з іх сем'ямі, прадстаўнікі ад партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый і інш.

У прэзыдыуме сходу—т. т. Чарвякоў, Грысевіч, Рыжоў і інш.

З вялікай прамовай аб задачах рабочае клясы ў сучасны момант выступіў тав. **Чарвякоў.**

Пасьля прамовы тав. Чарвякова дырэктар заводу тав. **Ледвіч** рапартаваў рабочым аб стане і пэрспэктывах заводу.

У 28-29 годзе па лесапільным цэху прамфінплян перавыкананы на 29.4 проц., па мэблевым цэху праграма таксама была выканана.

На сёнешні дзень на «Дрэваапрацоўшчыку» працуе каля 300 рабочых.

У гэтым годзе будзе прыступлена да пабудовы вялікай фабрыкі мэтраў. Гэта фабрыка будзе выпускаць у год каля 1 млн. мэтраў. Кошт пабудовы фабрыкі вызначаны ў 180.000 руб.

З прывітаньнямі выступілі т. т. **Грыгевіч, Рыжоў,** сакратар партыйнага калектыву заводу тав. **Скорман,** сакратар камсамольскай ячэйкі, прадстаўнікі піянэр-арганізацыі і рабочых, якія ад'яжджаюць у калгасы.

У гэты вечар партыйны калектыў заводу атрымаў **75 заяў ад лепшых перадавых рабочых аб уступленьні ў рады КП(б)Б.** Сярод падаўшых заявы шмат старых рабочых з вытворчым стажам ад 30 да 50 гадоў. Вось некалькі з такіх таварышоў: тав. **Вольпер**—сталяр, працуе па найме 44 гады, тав. **Мількін**—каваль, мае 30-цігадовы вытворчы стаж, тав. **Ясукевіч**—35-гадовы стаж, тав. **Бацьвіньнік**—30-гадовы стаж, тав. **Мясіла**—32-гадовы вытворчы ста, і інш.

Камсамольскі калектыў заводу перадаў у партыю 14 лепшых камсамольцаў.

Выступіўшая ад піянэрарганізацыі дзяўчынка-піянэрка заявіла, што піянэр-атрад, у адзнаку вялікага сьвята рабочых заводу, перадае 7 лепшых піянэраў у рады ЛКСМВ.

Вечар прайшоў з вялікім уздымам і энтузіязмам. Рабочыя горача віталі сваіх таварышоў, вылучаных на работу ў калгасы. Рабочыя калгасьнікі абяцалі, што яны пакладуць усе сілы, каб дапамагчы мясцовым арганізацыям у правядзеньні пасеўнай кампаніі і суцэльнай калектывізацыі.

На Менскай акруговай канфэрэнцыі калгасьнікаў

(Дзеньнік канфэрэнцыі)

Учора на ранішнім пасяджэньні канфэрэнцыі з дакладам аб задачах калектывізацыі выступіў сакратар Менскага акруговага камітэту КП(б)Б тав. **Славінскі.** Па дакладу разгарнулася шырокая спрэчкі. Выступілі т. т. **Груша** (Вузьдзенскі раён), **Вожак** Антаніна, **Бабчынскі** (Копыль), **Прыёмка, Мяхэдка, Сьмірноў, Гантман, Казакевіч, Навіцкі** (Бягомльскі раён), **Аксючыц** (старшыня Менскага акрвыканкому), **Хадасэвіч** Мар'я (Зэмбіна), **Куліковіч** (Лагойск), **Каладушка** (Астрашыцка-Гарадзецкі раён), **Хайкоў** (Пухавіцкі раён) і інш.

Канфэрэнцыю вітала дэлегацыя ад канфэрэнцыі рабочых палякаў Менску і Барысава. Канфэрэнцыя калгасьнікаў вылучыла 5 чалавек для адказнага прывітаньня.

Падрабязная справаздача аб канфэрэнцыі будзе дана ў наступным пумары «Зьвязды».

Канфэрэнцыя рабочых-палякаў

Учарайшае ранішняе пасяджэньне акруговай канфэрэнцыі рабочых-палякаў было прысьвечана спрэчкам па дакладу тав. **Бэнэна.** У спрэчках прыняло ўдзел шмат дэлегатаў.

Тав. **Шэйгель** у сваім выступленьні адзначыў, што рабочыя—палякі прымаюць і будуць прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве нашай адзінай бацькаўшчыны—СССР. Перад усімі рабочымі, у тым ліку і перад палякамі, стаіць задача дапамагчы ўладзе зьнішчыць кулацтва, як клясу.

Тав. **Тэтмаер** адзначыў, што рабочыя-палякі павінны прылажыць усе сілы, каб хутчэй выканаць нашу пяцігодку.

Работніца **Вагель** перадаючы канфэрэнцыі прывітаньне ад рабочых Барысава, падкрэсьліла, што працоўныя палякі ніколі ня мелі такіх магчымасьцяй для разьвіцьця нацыянальнай культуры, як пры савецкай уладзе. Мы маем шырокую сетку польскіх школ, пляцовак, бібліятэк, клюбаў і г. д. Толькі зараз мы можам выхоўваць дзяцей на нашай мове.

Многія выступаўшыя рабочыя ўнесьлі прапанову аб тым, каб у Менску быў забраны для культпатрэб пустуючы «чырвоны» касьцёл па Савецкай вул. для культурных патрэб.

Выступалі яшчэ т.т. **Марчак, Камянецкая, Сяліцкая** і інш.

Пасьля спрэчак з дакладам аб палітычным і эканамічным становішчы ў фашысцкай Польшчы выступіў т. **Будзінскі.** Канфэрэнцыя паслала прывітаньне ЦК КП(б)Б.

„Які з жанчыны мэталісты“

У пастанове ЦК УсеКП(б) ад 15 чэрвеня 1929 г. гаворыцца, што пяцігадовы плян народнае гаспадаркі забясьпечвае вялізарны рост прамысловасьці на базе рэканструкцыі і сацыялістычнай рацыяналізацыі, якая, у адзнаку ад рацыяналізацыі капіталістычнай, дае магчымасьць, без перашкоды для мацярынства, пашыраць ужываньне жаночае працы ў вытворчасьці, у тым ліку і цяжкой індустрыі.

Як-жа выконваецца гэта дырэктыва ва ўмовах беларускай прамысловасьці і, у прыватнасьці, на машынабудаўнічым заводзе «Энэргія»?

Можна сказаць, што гэта дырэктыва ня выконваецца зусім. Адміністрацыя і заводзкія арганізацыі пра гэту дырэктыву зусім забыліся. На заводзе «Энэргія» жаночая праца амаль што зусім ня ўжываецца. Жанчын на заводзе працуе толькі 1 з пал. проц. з агульнага ліку рабочых. Гэтыя лічбы гавораць аб тым, што трэба, як найбольш, уцягнуць жанчын у мэталяпрамысловасьць, што на кваліфікацыю жанчын трэба зьвярнуць максымум увагі.

Пры абгаварэньні праекту новага калдагавору былі высунуты пункты аб вызначэньні пэўнага процанту жанчын у бронь-вучнёўстве, аб адлічэньні 0.25 проц. з фонду зарплаты на ясьлі, аб кваліфікацыі жанчын на самой вытворчасьці і інш. Але вось, ня гледзячы на вышэйпаданую пастанову ЦК УсеКП(б) на рад пастаноў ВСНГВ і ЦСПСВ і інш., уключыць патрабаваньні рабочых у калдагавор адміністрацыя катэгарычна адмовілася, гаворачы: «Які ўжо там з жанчыны мэталісты: папрацуе год, а пасьля пойдзе ў дэкрэтыўны водпуск на 4 месяцы, а таму лепш зусім ня браць на завод і не кваліфікаваць іх». Бязумоўна, што ў выніку такіх адносін адміністрацыі да жаночай працы, жанчын на заводзе амаль што няма. Гледзячы на адміністрацыю, і некаторая больш адсталая частка рабочых—мужчын таксама адмоўна адносіцца да работы жанчын на заводзе.

Так, рабочы-сьвідравальшчык Ваўчок, выступаючы на сходзе, даводзіць, што з жанчыны ня можа быць токара або сьлесара, што жанчына павінна толькі даглядаць дзяцей і выконваць розныя хатнія дробныя работы.

Трэба зьвярнуць увагу, што на гэтым сходзе ні партыйная, ні прафэсыянальная арганізацыі зусім ня выступілі з растлумачэньнем няправільнасьці такіх поглядаў.

Пры такім становішчы мы маем невыкананьне дырэктыў партыі аб ужываньні рабочае сілы ў мэталяпрамысловасьці. Па ўсіх гэтых адмоўных зьявішчах у рабоце машынабудаўнічага заводу «Энэргія» трэба моцна ўдарыць.

Работніца.

МЕНСК

Першы на Беларусі завод пашыцьці кажухоў

З новага будаўнічага сэзону ў Гомелі пачнуць будаваць першы ў Беларусі завод, які будзе шыць аўчынныя кажухі. Завод будзе выпускаць прадукцыі на 4.500.000 руб. у год. Кошт будаўніцтва —1.750.000 руб. Завод будзе пушчаны ў 1931 годзе.

Выхадная дапамога добраахвотнікам, што едуць на работу ў калгасы

Наркампраны БССР растлумачвае, што рахунковыя работнікі і інш. добраахвотнікі, якія едуць на работу ў калгасы, маюць права на агрыманьне 2-х-тыднёвай выходнай дапамогі перад ад'ездам.

Спыняецца выплата дапамогі захваравшым ад п'янства

Галоўсацстрах пастанавіў ўспыніць усялякую дапамогу застрахаваным за першыя пяць дзён хваробы, якая зьвязана з п'янствам. Апрача таго, ня будзе аплачвацца страта працаздольнасьці ад п'янства або ўчынкаў, зьвязаных з п'янствам (бойкі, раненьне).

Праверка работы заводаў мэталятрэсту

Беларускі камітэт саюзу мэталістых арганізаваў спэцыяльную камісію ў складзе члена прэзыдыуму камітэту т. Сапожнікава, дырэктара Белмэталятрэсту тав. Фіша і прадстаўнікоў НК РСІ для праверкі работы заводаў па вырабе і рамонце с.-г. машын і запасных частак да надыходзячай весьнавой пасеўнай кампаніі. Для гэтай-жа мэты на прадпрыемствах выпучаюцца рабочыя брыгады.

Курсы для падрыхтоўкі рахункаводаў

Менская біржа працы арганізавала курсы: для дашкольных работнікаў—4-хмесячныя на 75 чал. і для падрыхтоўкі рахунковых працаўнікоў—3-хмесячныя—на 100 чал. Курсанты будуць атрымліваць стыпэндыі. Па сканчэньні курсаў яны будуць накіраваны на раёны.

Адказнасьць за выпуск нядобраякаснай прадукцыі

Прэзыдыум ЦВК БССР дапоўніў крымінальны кодэкс БССР арт. арт. 152—1 і 152—2. Гэтымі артыкуламі прадугледжана адказнасьць у крымінальным парадку за масавы або сыстэматычны выпуск нядобраякасных вырабаў, а таксама за незахаваньне абавязковых стандартаў.

Вылучэнства ў заняпадзе

У дзяржфінкантроль пры Гомельскім акрфа вылучаны на працу рабочы галоўных майстэрань Заходніх чыгунак т. Сазонаў.

Спачатку прымацавалі вылучэнца Сазонава да кіраўніка кантролю Ягудкіна, які, не растлумачыўшы Сазонаву работы кантролю, даў яму чытаць старыя акты. Пасьля прымацавалі вылучэнца да кантралёра Гразоўскага. Гразоўскі абышоўся з вылучэнцам ня лепш за Ягудкіна. Ён даў Сазонаву даўжэзны лист паперы з вялізарнай колькасьцю рознастайных граф, у якіх нават ня ўсякі спэцыялісты здолее разабрацца. Доўга працаваў Сазонаў над гэтымі таблицамі, але без належнага кіраўніцтва добрых вынікаў ня было. Адчуваючы сябе адзінокім, тав. Сазонаў вымушаны быў падаць заяву ў ячэйку аб тым, каб яго вызвалілі ад такой «прадукцыйнай» работы. Толькі пасьля гэтага была склікана нарада для абмеркаваньня пытаньня вылучэнства. І вось на гэтай нарадзе кантралёр Гразоўскі меў нагласьць заявіць: «Я не абавязаны вучыць Сазонава, які вучылівае пэнсію ня меншую за нас, вучоных».

Пытаньне: дзе быў мясцком і парт'ячэйка Гомельскага акрфа, у якіх на вачох адбываліся такія агідныя справы? Ці не зьяўляецца гэта вынікам таго, што яшчэ да гэтага часу ня выканана пастанова правертройкі аб зьняцьці з фінансавай работы кіраўніка дзяржфінкантролю Ягудкіна, які вычышчаны з партыі за бюракратызм?

СУСЕД.

Адчыняецца сталоўка для дзяцей рабочых

5-га лютага МЦРК адкрывае ў памяшканьні сталоўкі ЦРК № 6 дзіцячую сталоўку. Сталоўка разлічана на 45 дзяцей рабочых ад 8 да 13 год. Месцы будуць разьмеркаваны па прадпрыемствах. Кожнае дзіця на працягу паўтара месяца штодзённа будзе харчавацца ў сталоўцы. Пасьля гэтага тэрміну адбудзецца зьмена.

Абеды будуць абыходзіцца для дзяцей рабочых па 20 кап.

Галоўная мэта сталоўкі — даць узмоц менае харчаваньне дзецям рабочых.

За дзень

Выпуск прафкурсаў. Сёньня ў клюбе Ільліча пры ст. Менск адбудзецца ўрачысты вечар, прысьвечаны выпуску першых усебеларускіх прафкурсаў чыгуначнікаў.

Канфэрэнцыя фізкультурнікаў. Сёньня ў клюбе дрэваапрацоўшчыкаў адкрываецца ўсебеларуская канфэрэнцыя фізкультурнікаў - дрэваапрацоўшчыкаў.

Новы хлебазавод. Эканомнарада прызнала мэтазгодным пабудову ў гэтым годзе ў Полацку новага хлебазаводу. Значна пашыраецца віцебскі хлебазавод.

— Новы дырэктар Белмяса. Дырэктар акц. т-ва «Белмяса» тав. Холад вызвалены ад работы ў сувязі з ад'ездам яго на вучобу. Часова выконваючым абавязкі дырэктара «Белмяса» назначаны тав. **Кісялёў.**

— Усебеларуская нарада каапэрацыі. 5-га лютага ў Менску склікаецца ўсебеларуская нарада каапэрацыі па пытаньні аб рэарганізацыі работы нізоўкі ў сувязі з калектывізацыяй сельскай гаспадаркі.

Ганяюцца за аўтарытэтам

Хітрыкі папоў ды кулакоў ня маюць межаў, каб набыць сабе аўтарытэт. Яны пускаюцца на розныя махінацыі. Сярод яшчэ цёмнага сялянства яны распускаюць розныя чуткі: агітуюць супроць калектывізацыі, рэалізацыі пазык і інш. мерапрыемстваў партыі і савецкае ўлады. Гэта складае ім часовы аўтарытэт толькі сярод некаторай адсталай часткі сялянства.

Але, каб набыць аўтарытэт перад савецкай уладай, перад грамадзкасьцю—справа ня лёгкая, але-ж вераві рабочае клясы дадумаліся ашуканствам, хітрыкамі набыць сабе аўтарытэт, каб у далейшым перашкаджаць сацыялістычнаму будаўніцтву.

Падамо некалькі прыкладаў:

У сакавіку месяцы ў Бабруйскую акруговую пракуратуру паступілі весткі, што заможная частка насельніцтва вёскі **Капусьціна** пагражае падпаліць капусьцінскую школу, а таксама забіць настаўніцу **Кляеўскую,** старшыню сельсавету і інш., як заснавальнікаў школы з прычыны таго, што школа мае антырэлігійны ўплыў на моладзь. А ў часе перавыбараў сельсавету на дзьвярах школы зьявілася ананімная пісулька: «Далоў камуністых, Кляеўскую, што заснавала школу, сьмерць ім скора будзе, запалім чытальню, Глазкову куля ў лоб 1лаі Кляеўская з музыкай».

Праведзеным сьледзтвам і экспэртызай устаноўлена, што гэту пісульку, каб стварыць сабе аўтарытэт, пісала левай рукой сама Кляеўская С., жонка Бортнікаўскага папа. Зараз справа перадана ў нарсуд, які вядома папралетарску дасьць ёй належны «аўтарытэт».

А вось другі, ня менш цікавы факт. Кулак вёскі **Ноўні, Клімавіцкага раёну, Дзеравянка** Уладзімер, які ў 1920 годзе ўцёк з Чырвонай армії да палякаў, выкрываў актывістых сялян беднякоў, рабіў самагонныя апараты, за што потым панеслі кару беднякі, апрача таго эксплёатаваў батракоў і яшчэ вясной 1929 году, селянін тэй-жа вёскі Піскун за 20 фунтаў аўсу тры дні вазіў Дзеравянку гной. Каб зрабіцца беднаком Дзеравянка аддае горшую вямлю ў запасны фонд, а лепшую пераводзіць на жонку.

Так, кулак Дзеравянка стаў «пралетарам», пралез у члены саюзу камунальнікаў і зараз працуе на пабудовах Вазеневду ў Мазыры, а «нова» сьпечанага «пралетара» жонку нейкім чынам выбралі членам Калінкавіцкага райвыканкому.

Сяляне-беднякі вёскі Ноўкі вельмі абураны, што ў члены РВК выбралі жонку кулака эксплёататара.

Так ворагі рабочае клясы стварацца сабе аўтарытэт, але-ж не на доўга.

Н.

Работу транспарту—пад рабочы кантроль

Прэзыдум Белбюро ЦК чыгуначнікаў вызначыў рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы транспарту БССР да весьнавое пасеўнае кампаніі. На станцыях, у дэпо арганізуюцца спэцыяльныя рабочыя брыгады—паравозьнікаў, кандуктароў, аглядчыкаў вагонаў для кантролю за перавозачнай работай транспарту ў часе пасеўнае кампаніі.

Прызнана мэтазгодным арганізаваць чырвоныя і чорныя дошкі на станцыях і пунктах.

Адначасова прэзыдыум Белбюро зьвярнуўся ў ЦСПСВ і СНК БССР з просьбай даць указаньні зямельным органам аб забесьпячэньні чыгуначных майстэрань Беларусі с.-г. інвэнтаром, які патрабуе рамонту.

15 мэталістых выяжджаюць у саўгасы Зернятрэсту

Беларускі камітэт саюзу мэталістых прызнаў патрэбным паслаць на ставую працу ў саўгасы Зернятрэсту ў Ніжня-Волскім раёне 15 рабочых сьлесароў, якія будуць там працаваць па спэцыяльнасьці. Набор гэтых рабочых будзе праводзіцца такім-жа парадкам, як і вярбоўка рабочых у калгасы.

Канфэрэнцыі ўдаркікаў

ЦСПСВ склікае на 15-е лютага канфэрэнцыю ўдарнікаў Фрунзаўскага раёну і на 25-га лютага Кастрычніцкага раёну. Канфэрэнцыі будуць абгаварваць пытаньні аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі і задачах рабочае клясы, аб выкананьні прамфінплянаў за першы квартал 1929-30 году і далейшай рабоце ўдарнікаў.

Белдзяржбуд зрывае ўстаноўку турбіны

У газэтах паведамлялася ўжо аб тым, што Менская электрастанцыя апынулася ў цяжкім стане, працуе з надзвычайнай перагружанай і ня можа даць патрэбнай колькасьці электраэнэргіі для нашай прамысловасьці. Як вядома, электрастанцыя значна пашыраецца, будзе ўстаноўлена новая моцная турбіна.

Для таго, каб устанавіць турбіну, трэба пабудаваць валапрыёмнік для ахаладжэньня кандэнсатараў.

Гэта работа была ў свой час здана Вадаканалу, але апошні зараз згортвае работу ў Менску.

Эльвод зьвярнуўся да Белдзяржбуду з прапановаю ўзяць на сябе будаўніцтва валапрыёмніка, але і Белдзяржбуд таксама адмовіўся. Мы стаім перад фактам зрыву пуску турбіны, калі зараз-жа ня будуць ужыты ўсе захады, каб пабудаваць валапрыёмнік.

Трэба прымусіць Белдзяржбуд узяць заказ Эльводу.

ХОШЫЦЭР.

Пагромшчык на ўтрыманьні мазырскай страхкасы

Былыя людзі, ворагі рабочае клясы добра ўмеюць прыстасоўвацца да ўмоў савецкае ўлады, маскаваць сваё мінулае. Працэс гомельскіх чорнасоценцаў выкрыў частку такіх шкодніка́ў, але іх яшчэ шмат засталося на ўсім Савецкім Саюзе.

У Мазыры, напрыклад, жыве нейкі Нясенчык, былы член «союза русского народа», актыўны пагромшчык.

Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі Нясенчык замаскаваў сваё былое і некаторы час працаваў на фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік», але, паводле патрабаваньняў рабочых, быў зьняты з работы. Тады ён пайшоў у страхкасу і, як «сумленны» рабочы, быў залічаны інвалідам працы.

Нясенчык да 1-га студзеня атрымліваў пэнсію, і толькі цяпер, пасьля рабкораўскай заметкі ў «Зьвяздзе», высьветліўся яго сапраўдны твар, і Мазырская страхкаса зьняла яго з пэнсіі.

Такім чынам душыцель рэвалюцыйнага руху, пад выглядам рабочага, быў доўгі час на ўтрыманьні страхкасы.

Чорнасоценца Нясенчыка трэба прыцягнуць да адказнасьці ня толькі за ашуканства савецкае ўстановы, а і за мінулую актыўную контр-рэвалюцыйную дзейнасьць.

Н.

Бібліяграфія

№ 2. Ілюстраваны часопісі „Чырвоная Беларусь“

У рэцэнзіі на першы нумар «Чырвонай Беларусі», мы, між іншым, зазначалі, што гэткай часопісі чакаў наш масавы чытач. Калі моркаваць па тэй сустрэчы, якую аказалі чытацкія масы часопісі, дык здаецца, што мы ў сваіх вывадах не памыліліся.

Вось гэта якраз накладае адказны абавязак на рэдакцыю самое часопісі. Яна павінна ўмець замацаваць і пашырыць гэту зацікаўленасьць чытачоў. Бо зусім ясна, што яны патрабуюць ня толькі лёгкага чытаньня, або сэрыі малюнкаў; справа ідзе аб тым, каб ілюстраваная часопісь мастацкі адбівала працэсы сацыялістычнай рэканструкцыі і зьяўлялася стымулам увагі энэргіі працоўных мас. Адсюль вынікае патрэбнасьць акрэсьленай палітычнай установкі і шлянасьці ў адносінах да кожнай дэталі часопісі.

Выходзячы з такога пункту гледжаньня, мы і пяройдзем да разгляду другога нумару часопісі «Чырвоная Беларусь». Часопісь адкрываецца артыкулам Ів. Цьвікевіча, прысьвечаным пяцігадоваму юбілею БДВ. Юбілей гэты сапраўды зьяўляецца адным з найбольш яскравых сьцьвярджэньняў аб посьпехах нашае партыі ў галіне ажыцьяўленьня ленінскае нацыянальнае палітыкі і разьвіцьця пралетарскае культуры.

«За пяць год працы,—гаворыцца ў артыкуле,—БДВ выпусьціла ў сьвет на ўсіх 6-ці мовах звыш 7 мільёнаў байноў за справу рабочае клясы. Праўда, у гэтай 7-мільённай армії былі і «перабежчыкі» ў лягер буржуазіі, былі кнігі з нявытрыманай клясавай ідэалёгіяй. Выпраўляючы свае памылкі, беларуская кніжная фабрыка ўсё ўдасканальвае сваю прадукцыю, усё зьмяншае колькасьць ідэалёгічнага браку».

Гэта добра. Але-ж трэба дадаць, што палітычнае афарбленьне самога кнігалею, як быццам, гаворыць пра тое, што кіраўнікі БДВ выпраўляюць на справе свае памылкі вельмі туга. Шосты год работы выдавецтва павінен даць нам больш гарантый у тым, што яго прадукцыя будзе поўнасьцю ідэалёгічна добраякаснай, а ня толькі зьвядзецца да зьмяншэньня ідэалёгічнага браку. Для гэтага патрэбна, каб БДВ было ня проста «кніжнай фабрыкай», а пралетарскай крэпасьцю.

Шасьцігодзьдзе з дня сьмерці У. І. Леніна адзначана ў часопісі невялікім артыкулам—успамінамі і двума-трыма малюнкамі. Сярод гэтых апошніх ёсьць здымкі з поўных збораў твораў У. І. Леніна на замежных мовах. Аднак, чамусьці сярод іх няма здымку з твораў Леніна на беларускай мове. Нельга сказаць, каб шостая гадавіна сьмерці вялікага правадыра сусьветнага пралетарыяту знайшла ў часопісі выразны адбітак і за гэта чытачы, зразумела, не пахваляць рэдакцыі.

З літаратурных матар'ялаў найбольш моцнае апавяданьне Л. Радзевіча з жыцьця рабочых у краіне польскага фашызму, выкінутых на вуліцу з фабрыкі. Апавяданьне М. Гарэцкага «Палестына» напісана ў агітацыйным плянэ але зроблена так наіўна, што спыняцца на ім ня варта. У гэтым апавяданьні як калісьці любіў казаць Вялінскі, «усе спружыны на версе». Лепшае апавяданьне В. Каваля «На Прыпяці», хаця-ж і ў ім ёсьць элямэнты надуманасьці і прымітыву. Верш А. Александровіча «Сталіца» выкананы ў пляне: учора—сёньня—заўтра, гучыць, як і заўсёды ў яго, бадзёрым заклікам:

«Рэспублікі нашай сталіца
Ў Вялікае Заўтра—крыляй».

І сапраўды, сталіца БССР шпарка ідзе наперад, выкрэсьліваючы плямы старога «губэрскага Менску». Аб гэтым сьведчаць у прыватнасьці тыя новыя будынкі—унівэрсытэт, Дом селяніна, клюбы, дом ураду, рабочыя дамы,—якія архітэктурна афарбляюць новы Менск. Гэтаму прысьвечаны артыкул праф. Шчакаціхіна, у якім даецца разгляд архітэктурнага стылю новых будынкаў.

Гэта—асноўнае ў нумары. Рэшта матар'ялаў не зьяўляецца новым для чытача. Некалькі слоў трэба сказаць пра мастацкае афармленьне часопісі. Перш за ўсё кідаецца ў вочы цьмянасьць амаль усіх здымкаў і ілюстрацый (у мінулым нумары былі лепшыя). Рад ілюстрацый выкананы зусім неахайна (напрыклад, да тэксту апавяданьня Радзевіча). Ня зусім ўдала падабраны альбом здымкаў пад назваю «Па ўсіх куткох сьвету». Папершае, сюды ўваходзіць і такі «куток сьвету», як Менск, і таму даюцца здымкі т. т. Каркліна і Вэнека. Але гэта яшчэ сюды-туды. А вось навошта патрэбны былі партрэты новых буржуазных прэзыдэнтаў, а калі ўжо яны зьмяшчаюцца, дык патрэбен палітычны камэнтары да іх, а ня проста «новы прэзыдэнт Мэксыкі п. Октыс Рубіо», або «новы прэзыдэнт Швайцарыі п. Жан Мюсьсі». А вось наконт антысавецкай кампаніі ў Мэксыцы (пры новым прэзыдэнце), так і няма нічога.

Апошняя «краказябра» старонка зноў падвяла рэдакцыю. Мабыць, яна зьбіралася дапамагчы энтузіястым удар насьці і высьмеяць ілжэ-ўдарнікаў, а атрымалася так: на малюнку кулак саджае калом вокны ў хаце-чы[illegible] а пад гэтым такі ласьцінны [illegible] «ударная» работа саматужніка-ад[illegible]кі з поваду арганізацыі калектываў. Ну, чым-жа ня пэрл «сатыры»? Мы ня ведалі дагэтуль, што кулакі—шкоднікі зьяўляюцца «саматужнікамі-адзіночкамі». Што-ж, значыцца, трэба арганізавацца? Адным словам, ня востра, ня сьмешна, а толькі шкодна.

Вокладка работы мастака Барыса Малкіна, акрамя нядрэннага злучэньня фарбаў, больш ніякага ўражаньня, здаецца, не пакідае.

Мы маем падставу чакаць, што наступны нумар часопісі будзе лепшым як з боку мастацкага, так і грамадзка-палітычнага.

Р. К.

ЦІ МЭТАЗГОДНА ГЭТА?

На працягу раду год наша прэса абімяркоўвае пытаньне аб зьмяканьні жыльлёвага крызісу. Ва ўсю шырыню было пастаўлена гэтае пытаньне ў «Правдзе» тав. Ларыным, якія высунуў праект дзьвёхзьменнай работы ва ўстановах з мэтаю скарачэньня жыльлёвай плошчы, што займаецца ўстановамі.

У цэлым радзе гарадоў СССР і БССР гэты праект быў праведзены ў жыцьцё. Іменна, у мэтах захаваньня жыльноў вышэйшых савецкіх органаў, якія забараняюць заняцьце кватэр пад установы.

І ўсё-ж такі, наперакор усяму... Менскі гарсавет зьбіраецца перасяліць 6 сем'яў з дому № 77 па Савецкай вул. і перадаць гэтае памяшканьне акрпракуратуры. Мы ня будзем спрачацца, што пракуратуры памяшканьне патрэбна. Але дзе-ж здаровы розум? Замест таго, каб паварушыць мазгамі, упчыльніць некаторыя ўстановы, гарсавет ідзе па лініі найменшага супраціўленьня і дае згоду на скарачэньне жыльлёвай плошчы... ва сваіх выбаршчыкаў?

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

— Дом Камасьветы. А 7 гадз. увеч. адбудзецца кансультацыя т. Фэйгіна для т. т., якія індывідуальна займаюцца па вывучэньні гісторыі клясавай барацьбы. (Пакой № 23).

— Пэдгабінэт. Гурток настаўнікаў па вывучэньні **шэйнай справы.** А 8 гадз. увеч. у памяшк. чыгуначнай школы адбудуцца заняткі.

ЗАЎТРА

— НК РСІ БССР склікае на 4 лютага г. г. агульны сход рацыяналізатараў савецкіх устаноў г. Менску. Будзе заслуханы даклад члена калегіі НК-РСІ тав. Ракава «аб мэтадзе і выніках рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную». Пачатак роўна а 6½ гадз. увеч. у пам. НК РСІ (заля пасяджэньняў). Запрашаюцца рабочыя і служачыя.

— Дом Працасьветы. А 7 гадз. увеч. адбудзецца вечар абмеркаваньня працы акруговай пракуратуры. Будзе: даклад аб працы акруговай пракуратуры і пытаньні і адказы. Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску.

АД ЦК КП(б)Б

Усе таварышы, мабілізаваныя ЦК КП(б)Б для ўдзелу ў правядзеньні весьнавой пасеўнай кампаніі, павінны зьявіцца з лютага а 10 гадз. раніцы ў ЦК КП(б)Б (пакой № 6) за атрыманьнем камандыровачных пасьведчаньняў і матар'ялаў.

ФРУНЗАЎСКІ РК КП(б)Б ПАСТАНАВІЎ: паставіць на від сакратаром вытворчых ячэек т. т. **Каждану** (Друкарня БДВ), **Скорману** («Дрэваапрацоўшчык»), **Школьнікаву** («Прагрэс»), **Заранкінай** («Чырв. Тэкстыльшчык»), **Хойніку** (хлебазавод), **Чэркасаву** (шпалерная ф-ка), **Голубу** (Белжылсаюз), **Пэўзнэру** (п.-кал. друкароў), **Турчын** (Аўтакіраўніцтва), —за няяўку на нараду, скліканую РК на 2-га лютага.

***

Назначаная нарада Фрунзаўскім РК КП(б)Б на 2-га лютага пераносіцца на 4-га лютага а 6 гадз. увечары ў памяшканьні залі Акругкому КП(б)Б.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
З. ТОЛЬЛЕР.
Аўторак, 4 лютага для фабкому 1-й друкарні. Білеты ў фабкоме.
ГОП-ЛЯ, ЖЫВЕМ

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР“
З панядзелка, 3 лютага мастацкі фільм
ПАЛОНЬНІКІ МОРА
у 7-мі частках.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—навуковы фільм
КАЛМЫКІ
у 1 част.
Пітодзенна 2 сэансы; 1-га сэансу—а 3 г. 30 м. | Пачатак 1-га сэансу—а 2 гадзіне, Каса адкрыта ад 12 гадз.

Кіно „СПАРТАК“
З панядзелка, 3 лютага
ВЫДАТНЫ МАСТАЦКІ БАЯВІК
ВЯСЁЛАЯ КАНАРЭЙКА
Пачатак 1-га сэансу а 6 г. 30 м.
Каса—ад 5 гадзін.

ДАРМОВА ДЗЬВЕ КНІЖКІ
—З. БЯДУЛЯ—„Танзілія“ (Зборнік апавяданьняў)—
—П. ГЛЕБКА—„Шыпшына“ (зборнік вершаў)—
АТРЫМАЮЦЬ ГАДАВЫЯ ПАДПІСЧЫКІ на часопісь „УЗВЫШША“ ў 1930 г.
Яшчэ ня позна падпісацца на цэлы год.
Падпісная плата на год—5 руб.
Падпіску прымаюць усе паштовыя і выдавецкія канторы, Бюро падпіскі—«Кніга-поштай», упаўнаважаныя рэдакцыі і рэдакцыя «УЗВЫШША». Адрас: Менск, Савецкая, 68, Дом Пісьменьніка, «УЗВЫШША».

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА“.
Ад панядзелка, 3-га лютага, пасьля кожнага кіно-сэансу гастролі лепшых сатырыкаў
ГРОМАВА І МІЛІЧА.
З прычыны вялікага посьпеху
— 2-гі ТЫДЗЕНЬ —
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ГАЛУБЫ ЭКСПРЭС
Рэжысэр—І. Траўбэрг. Апэратар—Б. Хрэньнікаў, Мастак—Б. Дуброўскі-Эшкэ.
У галоўных ролях: кітайская актрыса—Сан-Бо-ян, С. Мінін, Ля-Дзі-до, І. Арвенін, Чужэван, І. Чарнан і інш.
Пачатак 1-га сэансу роўна а 7 г., 2-га—8 г. 40 м., 3-га—10 г. 40 м.
КАСА АД 5 ГАДЗІН.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“.
АД ПАНЯДЗЕЛКА, 3 ЛЮТАГА
нямецкі фільм, вытворчасьці Уфа-фільм 1929 г.
2-гі ТЫДЗЕНЬ ПАСТАНОЎКІ
ВІНАВАТЫ
(Судовая памылка)
У галоўнай ролі вядомы артыст
БЭРНАРД ГЕТЦКЕ
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. увечары.
Каса адчынена ад 5 гадз.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫ“ Ад панядзелка 3-га лютага
2-гі тыдзень | 2-гі тыдзень
НОВЫ АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ
МОАНА
(СЫН ПАЎДНЁВЫХ МАРЭЙ)
у 7 частках.
Звыш праграмы кіно- хроніка Савкіно № 80
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. Каса адч. з 5 гадз. увеч.

Менская Акруговая Інспэкцыя Працы
АБВЯШЧАЕ,
што ВУЧОТ СПЭЦЫЯЛІСТЫХ народнае гаспадаркі
ВЫТВАРАЕЦЦА Ў НАСТУПНЫМ ПАРАДКУ:
1, 2, 3, 4, 5 лютага—па заводах, якім паведамлена асобна.
5. 6, 7, 8, 9, 10, 11—павінны зьявіцца спэцыялісты ўсіх прамысловых, транспартных прадпрыемстваў і будаўніцтва.
Спэцыялісты усіх астатніх прадпрыемстваў і ўстаноў павінны зьявіцца, пачынаючы з 11-га і не позьней 24 лютага г. г.
Усе падлягаючыя вучоту асобы, якія пражываюць у горадзе, павінны ў 2-х дзённы тэрмін зьявіцца ў Акр. Інспэкцыю Працы для атрыманьня вучотных картак. Асобы-ж, працуючыя ў прадпрыемствах і ўстановах, якія знаходзяцца па акруговым цэнтрам, павінны атрымаць вучотныя карткі ў райвыканкомах і выслаць іх, разам з дакумантамі ў Акр. Інспэкцыю Працы.
Вучот вытвараецца ў памяшканьні Менскай Акруговай Інспэкцыі Працы штодзенна ад 6-ці да 10-ці гадзін увечары.
Асобы, якія да 25-II—30 г. не зьявіцца для ўзяцьця на вучот, БУДУЦЬ ПРЫЦЯГНУТЫ ДА КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЬЦІ.
УВАГА: па гор.